МОЛАДЗЬ —
БУДУЧЫНЯ НАРОДУ

АД ВЫДАВЕЦТВА

Гэтым мы пачынаем выдаваць свой беларускі часапіс у Францыі. Мо крыху й пазнавата. Самі мы гэта добра разумеем, але, на жаль, нельга гэтага было зрабіць раней, перадусім дзеля таго, што не хапала сродкаў. Тут, у Парыжы, шмат маем розных вельмі важных у агульнанацыянальным значэньні спраў, у абліччы якіх часапіс моладзі мусіў адысьці на задні плян. Да нядаўняга часу, наагул, было шмат беларускіх часапісаў, і нядрэнных нават, што да зьместу і формы, хоць і рататарных, і выдаваньне яшчэ аднаго часапісу не было неабходным. Апошнім часам, аднак, шмат якія зь іх зьвярнулі з папярэдняга шляху злучэньня нацыі і перайшлі на службу зарубежжа. Калі яшчэ паўгода таму яшчэ адзін часапіс не станавіў праблемы, то сяньня, з увагі на невялікую колькасьць запраўды добрай і культурнай прэсы, зьяўляецца амаль неабходнасьцю. І мы пастанавілі яшчэ больш патрэсьці кішэні сваіх суродзічаў тут, у Парыжы, а часапіс усё ж такі выдаць.

Трэба таксама падкрэсліць той факт, што апошнім часам у Францыю пад'ехала крыху нашых суродзічаў з іншых краінаў. Людзі апынуліся сярод чужакоў. Часта ня ўмеючы французкай мовы, цэлымі тыднямі ня маюць да каго вуснаў адчыніць, хіба толькі да каня, з якім працуюць, але й гэта ў чужой мове. У такіх абставінах жыцьцё чалавека робіцца страшэнна шэрым і немагчымым амаль да ператрываньня. Вось жа наш часапіс і будзе якраз той другой асобаю (а прынамсі, будзе імкнуцца стацца ёю), з якою нашы новапрыбылыя беларусы будуць гутарыць. З нашага часапісу яны даведаюцца, як жыве моладзь у цэнтры, да чаго імкнецца, аб чым думае. Даведаецца наш чытач таксама аб важнейшых фактах з нашага жыцьця ў Францыі. А калі чаго й не даведаецца, то будзе, прынамсі, мець прыяцеля, да якога зможа напісаць і запытацца аб тым, што хацеў бы ве-

даць. Не адзін з чытачоў захоча, пэўне ж, і сам напісаць што небудзь ці пра сваё жыцьцё, ці пра свае думкі, якія, пэўна, дакучліва атакуюць яго бедную адзінокую галаву ці то ў пару працы, ці ў пару адпачынку, а мо часамі зганяюць сон з вачэй уначы. Хай ніхто не стыдаецца, што ягоная рука болей прывыкла да касы ці плуга, чымся да пяра. Хай не стыдаецца і таго, што ня меў часу на ўнівэрсытэт ці гімназію і не навучыўся пісаць. Гэта не яго віна, гэта доля нашая была паганаю. Хай піша сьмела, як можа, а сябры з Рэдкалегіі зразумеюць, а калі чаго і не зразумеюць, то дадумаюцца і паправяць (у гэтым выпадку просім ня гневацца на нас за парушэньне аўтарскіх правоў). Просім пісаць усё, што ў галаву прыходзіць, а мы тут пастараемся выбраць тое, што цікава, і надрукаваць. Таксама просім пісаць, якія аддзелы Вы хацелі б бачыць у нашым часапісе, аб чым хацелі б ведаць, а мы заўсёды пойдзем на спатканьне.

Мы будзем старацца прылажыць усе сілы да таго, каб часапіс быў цікавы і сапраўды свой, а пунктуальнасьць і даўгавечнасьць яго будуць залежаць ад Вас, дарагія чытачы. Калі зьбяром адпаведную колькасьць падпішчыкаў, то думаем, што часапіс не загіне і будзе штораз багацейшы, прыгажэйшы, паважнейшы, а мо з часам пераменіцца і ў запраўдную друкаваную газэту.

Дай Божа!

№ 1, 1948 г.

НАШЫ ДУМКІ

«Моладзь» — гэтак гучыць назоў нашага часапісу, нашага, гэта значыць, часапісу той групы беларускай моладзі, якая з розных прычынаў апынулася ў Францыі.

Моладзь — гэта будучыня Народу!

Мэтай нашага скромнага часапісу ёсьць падтрымаць, усьведаміць і памагчы духова раскінутай па ўсім сьвеце беларускай моладзі.

Гэта патрэбна тым больш, што і так нешматлікіх беларускіх выданьняў шчэ паменшала праз адыход некаторых зь іх у варожы нам лягер, што здрадзіў агульна беларускую справу.

У працягу сваёй многавекавай гісторыі Беларускаму Народу даводзілася ня раз пераносіць шмат гора. І хоць

прыходзілі вельмі цяжкія часы выпрабаваньня, калі праз здраду слабых элемэнтаў, якія дзеля выгады і матэрыяльнай карысьці выракаліся сваёй Бацькаўшчыны, Ён ні на хвіліну ня траціў веры ў лепшую будучыню.

На вялікі жаль, як бачым, мінуўшчына не навучыла на будучыню. Як гэта здаралася раней, слабы элемэнт, узгадаваны ў варожым духу, здрадзіў нашу агульную справу і сяньня. Прыглядзеўшыся бліжэй да гэтай акцыі, ганьбячай усё, што ёсьць найдаражэйшае беларускаму сэрцу, як Акт 25 Сакавіка з БНР на чале і ўсё тое, што ёсьць запраўды беларускае, мы ня можам назваць гэтай акцыі нічым іншым, як здрадай Беларускаму Вызвольнаму Руху.

Наша ідэалягічная мэта — бараніць чыстыя, гарачыя, уласьцівыя беларускай Моладзі, сьвятыя пачуцьці каханьня да Бацькаўшчыны.

Мы будзем імкнуцца захаваць у сэрцах нашай моладзі цэнныя, несапсутыя чужацкімі ўплывамі, элемэнты, дапамагаючы Ёй адшукаць у сабе сілу, загартавацца і пасьвяціць сябе Роднаму Краю.

Будзем імкнуцца падтрымаць, даць пацяшэньне тым, хто, параўноўваючы наш лёс да лёсу папярэдняй эміграцыі, бачыць усё страчаным.

Будзем старацца быць братамі раськіданай па сьвеце беларускай моладзі, падтрымоўваючы на духу і паказваючы, што, страціўшы Бацькаўшчыну, а захаваўшы веру ў будучыню, трэба сьмела глядзець уперад, ведаючы, што Праўда пераможа.

Няхай сабе тыя, што прыгнечаныя векам і здэмаралізаваныя чужакамі, ганьбяць наш Народ, няхай топчуць наш незаплямлены Бел-чырвона-белы штандар, як гэта мела месца ў Міхельсдорфе, няхай сабе зьневажаюць нашу слаўную мінуўшчыну, няхай прадаюць свае пасівелыя галовы і сумленьне за настольныя адпадкі чужынцаў! Але няхай не забываюцца, што ёсьць яшчэ моладзь, у грудзёх якой гарыць агонь шчырага каханьня да Бога, Праўды і Роднага Краю, моладзь, якая сурова асудзіць тых, хто, сыйшоўшы ў бездарожжа, усялякімі спосабамі стараецца сьцягнуць туды і другіх.

Мы будзем старацца быць прыкладам маладому пакаленьню, на долю якога выпала нялёгкае заданьне — выбрацца з тога прадоньня, у якім сяньня знаходзіцца сьвет, а зь ім і мы — Беларусы.

Наша справа нялёгкая таму, што мы, беларуская моладзь, упершыню пасьля вяковай няволі спатыкаемся з Захадам і на кожным кроку мусім абвяшчаць чужынцам нашу мэту, разьбіваючы хлуслівую ману і «тэорыі» нашых адвечных ворагаў, жадаючых прадставіць нас у некарысным для нас сьвятле, а то й зусім давесьці, што Беларусь — гэта «истинно русская» зямля, альбо «крэсы».

Якім бы цяжкім ні было нашае заданьне, мы яго выканаем, стоячы на вышыні ўзложанага на нас абавязку і не жадаючы быць праклятымі будучымі пакаленьнямі, якія ў іншым выпадку, асудзілі б нас, як людзей, нягодных да асягненьня той мэты, якой зьяўляецца будучыня Роднага Краю.

Не нянавісьць і здрада будуць нашай зброяй, а чыстасардэчнасьць і запраўднае каханьне да нашай шматпакутнай Бацькаўшчыны!

Мы не баімся розных мянюшак, якімі так шчодра абдзяляюць нашыя ворагі сыноў паўсталага да змаганьня Беларускага Народу.

Мы сьмела й з гонарам дэкляруем сваю прыналежнасьць да адзінага запраўднага беларускага лягеру БНР, аддаючыся без засьцярогі пад загады яе Прэзыдэнта, які горда нясе незаплямляны сваімі папярэднікамі, а заразам мучанікамі Беларускага Народу, Бел-чырвона-белы штандар.

Мы, беларуская моладзь у Францыі, дэкляруем аддаць усе свае сілы, а калі зайдзе патрэба — аддамо і жыцьцё, каб жыла Беларусь і прызнаваны ўсімі паняволенымі й вольнымі народамі наш Бел-чырвона-белы штандар з БНР на чале горда шыбаў у высі, бо гэты штандар, абліты крывёю мільёнаў лепшых сыноў і дачок нашага Народу, даражэйшы нам за ўсё на сьвеце. Ён нам уручаны ў спадчыну.

Наша заданьне — заданьне палітычна сьведамай беларускай эміграцыі — не палягае на выдаваньне прэзыдэнцкіх і міністэрскіх пасадаў. Гэта справа Беларускага Народу ў Вольнай Беларусі, а мы, будучы ў выгнаньні, маем тое, чаго ня мае ні адзін наш брат у паняволенай Бацькаўшчыне, гэта значыць — вольны голас!

Вось жа праз гэты голас мы, дарагія браты, зьяўляемся беларускай амбасадай забранага Краю.

А калі мы ёй зьяўляемся, дык, адкінуўшы ўсе косткі ў постаці «крывічоў» ці «нацдэмаў», возьмемся за актуальную працу і справу, справу першай вагі, для якой, дарагія браты, мы пакінулі родны Край, а праз гэта ўсё найдараж

жэйшае ў жыцьці чалавека. Думаю, што ня знойдзецца сярод Беларусаў ні аднаго сьведамага і лягічна думаючага чалавека, які б за гэтым падзелам ня бачыў працы варожай і шкоднай нам рукі, якая гідка адводзіць наш узрок у бок ад нашай мэты — на дробныя, няважныя і неактуальныя для нас справы.

Хай жа ўсемагутная сіла дапаможа нашым братам высьцерагацца ролі Каіна, як нясьведамай, так і сьведамай, а калі гэтаму будзе месца, што ўжо назіраецца, дык няхай Беларускі Народ ня сэрцам а розумам, як дбалы лекар, спыніць гэтую гангрэну ў пачаткавай стадыі, калі яна ня ўсьпела заразіць здаровага цела, калі яна прадстаўляе сабой найменш небясьпекі.

Няхай жа, дарагія браты, мы будзем годныя нашых слаўных продкаў, аддаючы ўсе свае сілы на службу Бацькаўшчыне, а ўзнагародаю нам будзе Вольны Край і вечная памятка ў сэрцах нашых наступнікаў! […]

Янка Філістовіч

№ 1, 1948 г.

ВЯЛІКІ ДЗЕНЬ

У жыцьці кожнага народу ёсьць хвіліны ўздыму, радасьці ды шчасьця, як і хвіліны трагічнага ўпадку ды гора. Калі мы прыглядзімся да нашае гісторыі — убачым тое самае. Вялікі ўздым ды культурны росквіт беларускага народу ў XVIII ст. сілай гамуюцца ды занепадаюць, а на ягонае месца прыходзіць цёмная, нялюдзкая сіла чужынцаў, якая за паўтара веку вырывае з карэньнем усё культурнае насеньне, пасаджанае і дагляданае ў працягу X вякоў беларускім народам. Стан, да якога была даведзена нашая Бацькаўшчына маскоўскай няволяй, хіба найлепш схарактарызуем, падаўшы словы беларускага нашаніўца Ўласа, які сказаў: «Памёр бы спакойна, калі б пабачыў, што беларус зь беларусам перапісваюцца ў роднай мове». Вось гэтыя глыбока патрыятычныя словы, сказаныя ў пачатку XX стагодзьдзя, жыва прадстаўляюць нам становішча, у якім апынулася нашая краіна.

Але, зьнішчыўшы вольнае жыцьцё нашага народу, чужацкая сіла была ня ў стане зламаць ягоны дух. Глыбака захаваны ў сэрцах беларусаў, ён выяўляўся ў рашучых пра-

тэстах супраць няволі. Адным зь іх зьяўлялася паўстаньне 1863—64 гг. Дарма, што пераважаючая варожая сіла здушыла гэты ўздым. Волі да незалежнасьці яна не перамагла. Дарма трыюмфаваў вораг, думаючы, што пасьля сьмерці на шыбеніцы дыктатара паўстаньня Кастуся Каліноўскага назаўсёды паняволіць душу беларуса. Сталася наадварот. Чын Каліноўскага, як і ягоная ахвяра, запалілі ў сэрцах народу агонь, які выявіўся ў Акце 25-га Сакавіка 1918 году, які прагаласіў Вольную і Незалежную Беларусь, за што змагаліся і згінулі 85 год таму Каліноўскі і ягоныя пасьлядоўнікі. Як бачым, дзень 25-га Сакавіка не зьяўляецца прыпадковым ды малым у гісторыі беларускага народу, гэта дзень праяўленьня яго адвечных жаданьняў, у імя якіх цярпеў наш Край, змагаліся і па-геройску паміралі на шыбеніцах ды ў далёкай Сібіры ягоныя сыны. Гэта дзень, у які беларус, парваўшы путы няволі, заманіфэставаў перад сьветам сваё нязломнае жаданьне — быць гаспадаром на ўласнай зямлі.

Нічога, што і гэтаму сьветламу Акту не далі зьдзейсьніцца тыя ж самыя суседзі-ворагі, ён сваё зрабіў, бо паказаў, як пуцяводная, незгасальная зорка, дарогу нашаму народу, канчаткова збудзіўшы тых, якія яшчэ спалі.

Сяньня, у 31-я ўгодкі вялікага Сакавіковага Акту, мы бачым тое, да чаго клікалі Каліноўскі ды яго несьмяротныя праз свае творы прадаўжальнікі: Багушэвіч, Цётка, Багдановіч, Гарун, Купала, Колас і рад другіх паэтаў. Мы бачым, што агнём Каліноўскага запалілася ўся Беларусь. Нашыя лясы, якія заўсёды ў цяжкія хвіліны давалі прытулак свайму гаспадару, напоўненыя беларусамі, якія з надыходам адпаведнае хвіліны зробяць усё, каб канчаткова ажыцьцявіць Акт 25 Сакавіка.

Мы, беларуская моладзь, у вялікі дзень 25-га Сакавіка ўшануем памяць усіх братоў-герояў, загінулых за гэты сьветлы Акт, і будзем прыгатаванымі з надыходам часу за зрэалізаваньне яго, за волю Бацькаўшчыны не пашкадаваць найбольшых ахвяраў.

Янка Філістовіч

№ 9, 1949 г.

ПРАМЕНЬ СВАБОДЫ

Калі 25 сакавіка 1918 г. Беларуская Нацыянальная Рада абвесьціла Беларусь самастойнай сувэрэннай дзяржавай, у залі Кангрэсу засьвяціўся раньні прамень веснавога сонца, асьвятляючы прамянеючыя радасьцю абліччы дэлегатаў. Так апісвае гэты ўрачысты мамэнт у нашай гісторыі адзін з удзельнікаў. Сапраўды, векапомны Акт 25 Сакавіка можна параўняць з сонечным промнем; ён, як прамень, сагрэў беларускія сэрцы. З тым промнем, які ўпаў праз закратаваныя вокны вязьніцы, уліваючы ў сэрцы паняволеных надзею на лепшае заўтра, пабуджаючы кроў мацней кружыць у жылах. Да яго вязьні выцягваюць свае худыя касьцістыя рукі, на яго глядзяць іх сумныя вочы. Забытыя людзьмі, кінутыя ў падвалы турмы, яны ня маюць другое радасьці, акрамя гэтага цёплага промня, які ім прыносіць надзею свабоды. З падобнай надзеяй зьвярнуліся вочы ўсіх беларусаў на Акт 25 Сакавіка, які ставіў Беларусь, як раўнапраўную, у рады вольных дзяржаваў, зрываючы путы вяковай няволі. Але нядоўга давялося цешыцца беларусам з сваіх дасягненьняў. Бляск 25 Сакавіка прысланіла чорнае варожае крыло нахабных суседзяў, і зноў запанавалі цемра і зьдзекі. Тысячамі пагналі лепшых сыноў народа ў турмы Картуз-Бярозы, Салаўкоў ды на ссылку ў Сібір. Але кожны зь іх нёс у сэрцы надзею, што калісь іхнія мукі закончацца, і хоць не яны самі, дык іхнія нашчадкі дачакаюцца вызваленьня. А тыя, што засталіся на родных палетках, таксама гарэлі тым самым полымем, якое ахоплівала ўсё большыя кругі, гартавала новыя сілы да канчатковага змаганьня за свабоду.

Паводле Боскіх і людзкіх правоў, кожны чалавек на зямлі ёсьць істотай вольнай і ў аднолькавай меры можа карыстацца з усіх зямных дастаткаў. Толькі людзкія зайздрасьць і імкненьне да нажывы спрычынілі барацьбу, зладзейства, зьдзекі над другімі. Нашыя суседзі дапусьціліся адносна нас самага большага зладзейства, якое можна зрабіць адносна свайго бліжняга — гэта зрабаваньне свабоды. І зайздрасна сьцерагуць, каб мы яе не здабылі зноў, а навонкі паказваюць сябе як вялікіх гуманістых або хрысьціян, жадаючых нам дапамагчы, быццам мы самі ня здольныя даць сабе рады ў жыцьці. Укладаюць для нас канстытуцыі, падпісваюць цэлы рад дагавораў супрацоўніцтва і дапамогі нам, але ўсё гэта мае столькі вартасьці, колькі варты маральна адзінкі,

якія іх падпісваюць. Прыгожыя словы, прыгожыя праекты прыкрываюць, быццам фанера, іх сапраўдныя фальш і нянавісьць. Толькі адзіны аргумэнт можа на іх паўплываць — сіла. А сіла наша ў нашай еднасьці, арганізаванасьці вакол Рады і Ураду БНР ды непахіснай волі да змаганьня за ажыцьцяўленьне Акту 25 Сакавіка. Таму ворагі беларускага народу прыкладаюць усе стараньні, каб гэтую сілу разьбіць, і яны заўсёды будуць дзеяць у гэтым напрамку. Але калі кожны з нас цьвёрда пастановіць у сваім сэрцы, што лепш загінуць вольным, чым памерці нявольнікам, дык пераможам усе перашкоды і створым такую сілу, якая здолее ўзьняць волатаў меч, каб адсячы чорнае крыло, што прысланіла нам сонца.

Кожны з нас мусіць ведаць і адчуваць, у якой ступені ён можа спрычыніцца да росту гэтае сілы.

№ 30, 1953 г.

АБ ЧЫМ НАМ ТРЭБА ПАМЯТАЦЬ

Беларуская эміграцыя, апынуўшыся па-за межамі сваёй Бацькаўшчыны, пастаўлена перад вялікім і адказным заданьнем. Гэта заданьне не палягае выключна на годнай рэпрэзэнтацыі нашага народу ў чужыне, наша заданьне шмат большае і адказьнейшае.

Знаходзячыся нярэдка ў вельмі цяжкіх абставінах, мы мусім выканаць тое, чаго не можа зрабіць наш народ у паняволенай Бацькаўшчыне.

Без сумліву, што адказнасьць гэтая ёсьць вялікай і цяжкой, але мы яе выканаем, бо мы сьведамы тых цяжкасьцяў, якія з гэтым спалучаныя, і перакананыя ў перамозе. Тут, як нельга лепш, сказаў вялікі французкі псыхалёг Корнэйле: «Той, хто пастановіць перамагчы ці памерці — рэдка бывае пераможаны».

Сапраўды, каб чагосьці дабіцца, штосьці асягнуць, трэба ў гэта цьвёрда верыць. Зразумела, што ў гэтым выпадку няма мовы аб унікненьні ахвяр — якраз адваротна. Толькі праз ахвяры асягаюцца вялікія справы. Ахвяра, зложаная на аўтар Бацькаўшчыны, не аслабляе сілу сваяго народу, але яе збольшвае. Вось што піша Максім Багдановіч, параўноўваючы чалавека да галіны:

Зразаюць галіны таполі адна за адной…
Бяз скаргі яны на зямлю чарадою лажацца,
Бо сьмерць іх патрэбна, каб дзерава новай вясной
Магло бы хутчэй разьвівацца.

Няма ніякага сумліву, што чакае нас вялікае выпрабаваньне нашых сілаў. Але каб быць да гэтага выпрабаваньня гатовымі, ужо сяньня не павінна быць між намі ніводнага беларуса, які б у гэты гістарычны час ня ведаў, дзе ягонае месца. На вялікі жаль, рэчаіснасьць паказвае якраз адваротнае. Нядаўна атрыманы рэдакцыяй ліст, у якім сябра піша, што ня ведае, якую заняць пазыцыю і застаецца пасыўным, насоўвае нам, паколькі гэта адносіцца да нашай будучыні, зрабіць адпаведныя заўвагі.

У нас, беларусаў, сяньня ёсьць толькі адна пазыцыя, гэта — БНР, агалошаная Беларускім Народам праз Акт 25 Сакавіка 1918 г.

Паколькі Беларускі Народ пасьля гэтага Акту не выражаў сваёй волі, аб якой пад акупацыяй ня можа быць і мовы, сяньня мо ў большай меры, як калі, Акт гэты для нас зьяўляецца сьвятым і абавязуючым. І таму няведаньне, якую заняць пазыцыю, тлумачыцца або няведаньнем нашай гісторыі, або зьнецікаўленьнем да агульнай справы, што ў часе змаганьня зьяўляецца раўназначна здрадзе.

Зразумела, што вораг беларускага нацыянальна-вызвольнага руху і ўсе выступаючыя пад маркай «астроўшчыны», будуць імкнуцца далей аслабіць наш рух, а гэтым самым — падставу нашай дзяржаўнасьці. Зьменшыць лік актыўных, а збольшыць — пасыўных, каб лягчэй асягнуць сваю мэту, — вось да чаго яны імкнуцца. Вось у гэтым напрамку і праводзіцца варожая праца.

Знаючы гэта, у нашых радах няма месца на хістаньні ці няпэўнасьці, бо ў час барацьбы гэтым самым мы аслабляем нашы нацыянальныя сілы, а збольшваем шанцы ворага ў асягненьні яго чорнай працы.

Злучыўшы нашы рады, мы павінны даць рашучы адпор усялякай варожай акцыі, якога б колеру яна ні была. Пад якой бы фірмай вораг ні выступаў, ён нясе паняволеньне нашаму народу. Таму абавязкам кожнага сьведамага беларуса, сэрца якога баліць аб долі Роднага Краю, зьяўляецца безагляднае змаганьне з варожай акцыяй, якая нясе нам загладу. Усялякае ж устрыманьне ў барацьбе — гэта беспасярэднія чыненьні, аслабляючыя нашую сілу. У гэтым вы-

падку мы павінны застасавацца да слоў Напалеона, які сказаў: «Цьвёрдая пастанова ёсьць найвышэйшай мудрасьцю».

Мы, беларуская моладзь, можам быць гордыя, што ў гэты гістарычны час у змаганьні пад бээнэраўскім бел-чырвона-белым штандарам за лепшую долю нашага народу зможам узяць актыўны ўдзел. А калі доля запатрабуе ад нас жыцьця, мы яго аддамо для таго, каб жыла Беларусь.

Я. Ф.

№ 4, 1948 г.

НА ТЭМЫ ДНЯ

Неяк ужо злажылася, што мы, беларусы, глядзім на палітыку заходніх дзяржаў у адносінах да Саветаў зь вялікаю дозаю скептыцызму. Робім мы гэта не бяз пэўнай рацыі. Справа ў тым, што ўсё тое, што нам было яснае ўжо гадоў восем, усё тое, што заходнія грамадзтвы называлі яшчэ ў 1945-46 годзе як найменш шкоднаю прапагандаю, сяньня сталася дыпляматычнаю моваю нават гэтакіх паўстрымлівых дыпляматаў, якімі зьяўляюцца англійцы. Але ня ўсё гэтыя дыпляматы зразумелі. Як часта яшчэ гучаць галасы аб патрэбе шуканьня паразуменьня між Захадам і Усходам і г. д. Ясна, што нам, якія добра пазналі тую дэмакрацыю на ўласнай сьпіне, іначай і нельга рэагаваць на гэтакія думкі, як толькі ўсьмешкаю або палітаваньнем. Тым ня менш, ня ўсё нам выпадае гэтакім спосабам успрымаць. Ёсьць справы, якія дакранаюць нас беспасярэдна, і ў гэтых выпадках нам нельга маўчаць.

Апошнім часам здарыліся тры падзеі, побач якіх нам нельга прайсьці моўчкі. Гэта прамова Чэрчыля на кангрэсе кансэрватыўнай партыі Вялікай Брытаніі, а таксама высказаньні спадара Варэна Аўстына, дэлегата Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі і спадара Гэктэра Макнэйля, дэлегата Вялікай Брытаніі на Агульны сход Аб'еднаных Нацыяў, які цяпер трывае ў Парыжы.

Спадар Чэрчыль — гэта муж стану, які сяньня, нягледзячы на тое, што не належыць да ўраду, зьяўляецца сьветачам для палітыкаў Захаду. Дзеля гэтага нам ня можа быць абыякавым тое, што кажа Чэрчыль, асабліва калі пасярэдне ці беспасярэдне кранаецца нашай справы.

Яшчэ два гады таму Чэрчыль казаў пра лінію Любэка—Трыест як пра жалезную занавесу, што дзеліць сьвет на Усход і Захад. Сяньня ва ўспомненай вышэй прамове Чэрчыль казаў аб неабходнасьці выкінуць бальшавікоў за лінію Керзона на «свае абшары» і асвабадзіць 11 дзяржаў з-пад бальшавіцкага панаваньня. Няцяжка заўважыць тут досыць значны прагрэс. На жаль, гэтым разам у перакананьнях сп. Чэрчыля, як і раней, Беларусь — гэта «свае абшары» маскалёў. І не дзівота. Дасюлешнія падручнікі і літаратура, якія служаць сп. Чэрчылю для вывучэньня геаграфіі і гісторыі, не ўспамінаюць аб Беларусі. А калі і ўспамінаюць, дык як аб расейскай правінцыі. Не яго віна, што ён гэтак думае, ёсьць тут трохі і нашай віны. Мы недастаткова выкарыстоўваем нашае становішча палітычных эмігрантаў, каб інфармаваць, каго трэба, у адпаведны спосаб.

Нам трэба было б на кожны гэтакі выпадак рэагаваць, хоць бы прыйшлося пісаць і да самога сп. Чэрчыля. Пры гэтым трэба выясьняць, інфармаваць і выпраўляць сьведамыя ці нясьведамыя памылкі. Неабходна было б выясьніць, што Беларусь — гэта не «савецкія абшары», а абшары, сілаю захопленыя ў 1920 годзе, нягледзячы на тое, што Рада Беларускай Народнай Рэспублікі ад імя ўсяго беларускага насельніцтва абвясьціла волю стварэньня сваёй Беларускай дзяржавы. Трэба выясьніць, што беларускі народ ужо перарос той стан, калі аб ім дэцыдавалі без яго, і ані на маскоўскую, ані на ніякую іншую няволю ня згодзіцца ніколі. Трэба выясьніць, што ня будзе супакою ва Усходняй Эўропе датуль, пакуль хоць адна пядзя этнаграфічнай Беларусі будзе заставацца не ў беларускіх руках. Трэба выясьніць, што затрыманьне гісторыі на «статус кво» з 1939 году ёсьць немагчымым і што эмансыпацыя паасобных народаў была, ёсьць і будзе гэтак доўга, як доўга будзе існаваць чалавецтва. Трэба таксама выясьніць, што барацьба за незалежнасьць народу ёсьць зьявішчам шляхетным і ня можа быць дыскваліфікаваная з прычынаў якіхсь там забавязаньняў чыіхсь урадаў, ці з прычыны карыстаньня гэтымі землямі якімсь суседам. Трэба выясьніць, што генацыд (народабойства) ня можа быць талераваны як у адносінах да народаў, якія атрымалі незалежнасьць паводле Вэрсальскага трактату, так і ў адносінах да народаў, якія не атрымалі яе тады. Неабходна таксама выясьніць, што лінія Керзона — гэта не лінія мяжы між Беларусяю і Польшчаю; гэта папросту

адвольная лінія, як і Рыская мяжа, пры дапамозе якой тагачасныя палітыкі імкнуліся задаволіць польскія апэтыты і польскі «дранг нах Остэн». Сапраўдная лінія, разьдзяляючая гэтыя дзьве краіны, бяжыць 16 кілямэтраў на захад ад Беластоку па рэчцы Нарве, а адтуль на паўночны-захад да ўсходне-прускай мяжы і на паўднёвы-захад да Буга і далей аж да Белай-Падляшскай. Трэба таксама ведаць сп. Чэрчылю, што польскія апэтыты значна большыя, чым можна было спадзявацца зь іх колькаснага ліку, і іх ніяк не супакоіць некалькімі паветамі беларускай зямлі і сотнямі тысячаў беларускіх душаў. Ім мроіцца імпэрыя (моцарство), беларуская спрадвечная Вільня разам з усёй Заходняй Беларусьсю. Дык лепей выбраць чэсны шлях, бо і так прыяцелем палякаў не давядзецца быць. Трэба таксама ведаць, што польская прапаганда не ўстрымоўваецца ні перад чым і паслугоўваецца для сваіх мэтаў беларускімі рэнэгатамі, як сучаснымі, так і патомкамі ранейшых, і пры падтрымцы «віленчукоў», «жубраў», «жбікоў» і іншых быдлят ужо цяпер падрыхтоўвае напад на Заходнюю Беларусь, як калісь зрабіў Жэлігоўскі.

Трэба станоўка сьцьвердзіць, што Беларускі Народ узышоў на шлях барацьбы за сваю незалежную дзяржаву і з гэтага шляху ня сыйдзе, хоць бы шмат каму давялося ў гэтай барацьбе загінуць. Гэта трэба зрабіць неадкладна, і калі нашага голасу не паслухаюць, тады толькі мы будзем мець права абвіняць.

Іншая крыху справа з высказаньнямі спадароў Макнэйля і Аўстына. Гэтыя людзі папросту за польскай прапагандай назвалі Заходняю Беларусь Усходняй Польшчай. Можа, думалі гэтакім спосабам даняць «таварыша» Кісялёва? Дык дзе ж там: гэты чалавек ня лішне сумаваў бы, каб і ўсю Беларусь забралі, абы толькі гэтак сказаў «геній чалавецтва». Але мы павінны станоўка пратэставаць, бо Заходняя Беларусь — гэта не Польшча, гэта карэнныя беларускія землі, якія былі захопленыя сілаю Жэлігоўскім у 1919 годзе, на якіх пасьля польскі ўрад праводзіў сваю «нацыянальную палітыку» пры помачы Косткі-Бярнацкага і Картузкай Бярозы.

Таксама фарс галасаваньня ў Беластоку ня быў толькі фарсам. Пэўна, каб на гэты сход бальшавікі дапусьцілі сапраўдных прадстаўнікоў Беларускага Народу, было б пастаноўлена ня толькі далучыць Заходнюю Беларусь да Усходняй, але і Усходнюю Беларусь адлучыць ад Масквы. Але і тыя бальшавічкі, што там прымалі ўдзел, не маглі не галасаваць за злучэньне Беларусі, бо гэта было б і не лягічным, і подлым. 22 кастрычніка 1939 году Беластоцкі сход іначай галасаваць ня мог. І сяньня кажны беларускі патрыёт прызнае, што ляпей нават няволю зносіць, калі народ у цэласьці, бо тады, прынамсі, не пагражае падзел у народзе. За гэтакае злучэньне змагаліся як Беларусы пад польскай акупацыяй, так і пад расейскай амаль 30 гадоў, і ніхто ня мог не скарыстаць з нагоды, каб гэты факт аформіць. Хоць усім добра ведама, што злучэньне Беларусі ніяк не азначае анэксіі Беларусі да Масквы.

Да таго трэба ведаць заходнім магутнасьцям, што маскоўскага імпэрыялізму ніяк ім ня ўдасца паўстрымаць ні з Варшавы, ні з Рыгі, затое можна яго паўстрымаць са Смаленску, Бранску, Харкава і Данбасу.

Грамадзянін

№ 5, 1948 г.

НАШ АДКАЗ

Няма ніякага сумліву, што нашыя суседзі добра асьвядомлены як адносна нашай мінуўшчыны, так і ў тым, што яны намагаюцца зрабіць сваімі захопніцкімі пасяганьнямі. Яны, маючы за сабой асягненьне, якое іх падбадзёрвае да наступу, дзе толькі могуць стараюцца пашкодзіць беларускай справе. Гэтым асягненьнем зьяўляецца абрабаваньне нашага народу з яго сапраўднага імя, а прышчапленьне чужога, якое ня толькі путае нашу справу, але і наогул сьведчыць супраць нас.

Прычынай, выклікаўшай паяўленьне нашага артыкулу, зьяўляецца дыскусія беларускіх прадстаўнікоў студэнцтва зь летувіскімі на агульна-эміграцыйнай студэнцкай зборцы ў Парыжы. Пасьля дакладу, адчытанага нашым прадстаўніком, ды адсьпяваньня беларускага нацыянальнага гімну, які студэнты праслухалі стоечы, беларусам былі зададзеныя пытаньні, на якія былі даныя вычарпальныя адказы. Жадаючы пазнаёміць нашу моладзь, як і ўсё беларускае грамадзянства, з закідамі, якія рабіў нам летувіс, падамо іх ніжэй, як і нашыя адказы.

Беларускае грамадзянства павінна даць рашучы адпор на ўсялякія новыя захопніцтвы, ня толькі тэрытарыяльныя,

але і гістарычныя. Каб быць годнымі сваіх слаўных продкаў, мы мусім бараніць іх вялікую працу, іх тысячагоднія здабыткі, ведаючы, што нашая недацэнка гэтай важнай справы толькі асьмеліла б ворагаў.

Летувіскі прадстаўнік студэнтаў закінуў: 1) Літва сярэдняга веку і сяньняшняя Летува — адно, што Беларусь сяньняшняя была заваявана Жамойцю; 2) беларуская мова з часоў Вялікага Княства Літоўскага была іншай ад сяньняшняй, што яна была «славонам» і ўжывалася ў В.К. Літоўскім як чужая; 3) беларуская дзяржава не патрапіць утрымацца бяз доступу да мора, а каб карыстацца Летувіскім, мы павінны здабываць іх сымпатыі (г. зн. аддаць ім Вільню ды палавіну Беларусі — рэд.), як і сымпатыі іншых народаў. У імя згоды, для перамогі над бальшавізмам мы, беларусы, павінны адрачыся ад свайго права...

Як жа выглядае справа з закідамі ды наогул з правам да В.К. Літоўскага, пабачым ніжэй.

Усе гісторыкі, як польскія, так і расейскія, абыходзяць пэрыяд арганізацыі В.К. Літоўскага, гэтае «зачараванае» для іх мейсца, або пабежна, або маўчком, а калі і стараюцца яго разьвязаць — дык падходзяць да яго фальшыва ад пачатку да канца. Гэтае фальшаваньне ўдавалася ім тым больш, што ні адзін зь беларускіх гісторыкаў не працаваў над гэтым неасьветленым, ды найбольш балючым пытаньнем у нашай гісторыі. Ня дзівіць нас тое, што нашы суседзі летувісы, якія ўваходзілі ў склад нашай дзяржавы — Літвы — як яе пэрыфэрыя, Жамойць, заяўляюць сяньня свае правы да тэй жа Літвы, нашай Бацькаўшчыны ў мінуўшчыне. Мы бачым ў гэтым папросту неразуменьне летувісамі таго, чаго яны жадаюць, што, зрэшты, зусім нармальнае зьявішча, калі дапусьціць, што дзеля вывучэньня В.К.Літоўскага яны паслугоўваліся матэрыяламі нашых суседзяў, як палякаў, так і расейцаў. Летувісы дамагаюцца земляў, якія займала адно з нашых шасьці плямёнаў — люцічаў-вялетаў (ваўкоў), у запраўднасьці гэта вельмі сьмешна выглядае, і мы не сумляваемся, што прыйдзе, час калі летувісы ня тое што ня будуць дамагацца, але будуць саромецца за свае крокі ў гэтым напрамку. Яны дамагаюцца сяньня Вільні і карэннай нашай зямлі да Маладэчна, забываючыся, што люцічы-вялеты, нашыя слаўныя продкі, заснавальнікі Літвы, занімалі абшар ня толькі да Маладэчна, але і да Коўна, нат з ім улучна. Значыць, мы, беларусы, маем права

дамагацца сяньня Коўна. Калі б летувісы асьведамілі гэта, яны напэўна не выклікалі б «ваўка зь лесу».

Дзякуючы працы вялікага чэскага вучонага славянскай старажытнасьці Шафарыка, які асьветліў пэрыяд арганізацыі В.К. Літоўскага, ды наогул ягонае паходжаньне, нам вядома, што Літва паходзіць ад чыста славянскага племя вялетаў-люцічаў, а не ад Жамойці, у якой на той час, паводле Шафарыка, ня толькі не было ні аднаго падобнага назову, але нат ні аднаго, які б пачынаўся літарай «л». У сваёй працы «Славянскія старажытнасьці», выд. у 1862 г. у Празе, Шафарык даводзіць, што вялеты-люцічы жылі ў сяньняшняй Віленшчыне і Гарадзеншчыне. У часе вандроўкі народаў частка племя вялетаў-люцічаў, «авантурыстычная моладзь» ды «ваяўнічыя важакі» выліваюцца па-за граніцы сваёй Бацькаўшчыны і, затапляючы Прыбалтыку, маршыруюць у Паўночную Нямеччыну, якую яны лёгка займаюць, выціскаючы адтуль астаткі германскіх народаў, якія пайшлі на Рым, ды асядаюць там, занімаючы гэтакім чынам усю Паўночную Нямеччыну аж да берагоў Брытаніі. Гэта адбывалася прыблізна, каля 2—3 стагодзьдзяў па народжаньні Хрыста. Іхняе ўладаньне ў Паўночнай Нямеччыне трывала да X—XII стагодзьдзяў. Калі ж германскія плямёны вяртаюцца назад, люцічы пад іх напорам пакідаюць заваяваныя землі ды вяртаюцца ў сваю Бацькаўшчыну. Паварот «ваяўнічых важакоў», якія пабачылі сьвету, і выясьняе тое спантанічнае стварэньне моцна арганізаванай дзяржавы Літвы, якая й пераймае ініцыятыву Полаччыны, дзе ў той час вымірае старая дынастыя Усяславічаў (Д.-Зап. ст.71), — арганізаваньня пакрэўных сабе плямён, каб супольна даць станоўкі адпор як крыжаком, так і татарам. Шафарык піша: вялет (па-грэцку обэлтаі) ёсьць імя калісь магутнага, а ў гісторыі сярэдніх вякоў над многа іншымі праслаўленага народу вялетаў, або іначай люцічаў, па мянушцы ваўкоў, які александрыцкім географам быў упершыню на сьвятло вынесены ды аддаленым патомкам шчасьліва пахаваны» (Том I, бач. 242; Том II, бач. 586).

Тое, што Літва паўстала не з Жамойці, а з люцічаў-вялетаў, пацьвярджае за Шафарыкам праф. Нідэрле. У сваёй працы «Manuel de antiquite slave» ён піша: «Los Veletos ne sont pas des Lithuanic en depit des offort de Mullenhoff pour etablir le contraire en il voquant une transcription du non slave de Litva: ce sont en real te des Veletes Slaves».

Аб тым, што беларус — гэта калішні ліцьвін, ды наогул, што імя беларус перш не ўжывалася як імя ўласнае нашых продкаў, а было накінута нашаму народу толькі ў XIX стагодзьдзі, сьведчыць польскі вучоны А. Брукнэр, які ў сваёй працы пад назовам: «Rusko-Polski rękopis roku 1510» (Slavia, VII.I.B. 10—11) піша: «Movimy ciagle «litowski, Litwin» ale to tylko zamiast «bialoruski, Bialorus», bo w roku 1510 nic o Litwie wlaściwej etnograficznej ani się śnilo, jeszcze Roj w roku 1562 Litwinem Bialorusina nazywal, a w Moskwie i w XVII wieku «Litewskij» tyle co bialoruski».

Гэтых доказаў, здаецца, аж занадта хапае, каб упэўніцца ў тым, што Беларусь — гэта ўчарашняя Літва. Летува ж, калісьці Жамойць, уваходзіла ў склад нашай магутнай дзяржавы толькі з узгляду на сваю слабасьць супрацьставіцца крыжацкаму напору. Зрэшты, як падана ў дакладзе па-французку, адно тое, што як заснавальнік Літвы Мяндоўг, так і найбольшы яе герой і палітык Вітаўт, каб абараніць сяньняшняю Беларусь, заўсёды, калі ім прыходзілася туга, аддавалі Жамойць — сяньняшняю Летуву — крыжаком, найлепш пацьвярджае вышэй сказанае. Ведама, што Жамойць (Летува) ня раз паўставала супраць Літвы (Беларусі), у часе аднаго з такіх паўстаньняў у 1263 г. згінуў сам заснавальнік Літвы — Мяндоўг. Ягоны сын Вайшэлак жамойцкай кроўю здушыў гэнае паўстаньне. Проста недарэчным зьяўляецца, што летувісы сяньня прэтэндуюць на тое, супраць чаго іхнія продкі так палка змагаліся як супраць чужога, варожага.

Тое, што беларуская мова з часоў В.К.Літоўскага была крыху іншай ад сяньняшняй — нармальнае зьявішча. Кожнаму асвечанаму чалавеку ведама, што жывая мова кожнага народу зьмяняецца, прагрэсуе зь бегам часу. Нашая літаратурная мова зьмянілася таксама, як і ўсе іншыя. Гэтага можа ня ведаць летувіс, літаратурная мова якога стварылася ў апошнім стагодзьдзі. У доказ, што нашая мова не была «славонам», а роднай беларуска-нацыянальнай, прыводзім словы расейскага гісторыка Бацюшкава, які піша: «Доктор Ф. Скорина, уроженец города Полоцка, усердно занимался переводом славянских книг на литовский язык» («Белорусия и Литва», 1890 г., ст. 159). Што за літоўскі быў гэты язык, здаецца, даказваць тут непатрэбна, бо ведама гэта ўсяму сьвету. Ужо той факт, што Скарына мусіў тлумачыць кнігі з славянскага языка на літоўскі (беларускі)

сьведчыць, што нашая мова, хоць базуецца на славянскай, як і ўсе мовы славянскіх народаў, але не зьяўляецца «славонам», толькі нацыянальна-беларускай. Піянер беларускага друку Ф. Скарына ў прадмове да «Псалтыры» гаворыць ясна, што друкуе яе: «…к пожытку посполітому… вразуменьня раді простых людзей...». Мова нашая не ўжывалася ў В. К. Літоўскім як чужая (як лаціна ў другіх краях), што стараўся даказаць летувіс, але як свая родная — пацьвярджаюць гэта словы Скарыны з той жа самай «Псалтыры», дзе ён кажа, пачаў друкаваць у роднай беларускай мове «найболей з тое прычыны, кже мя милостивый Бог з того языка на свет пустил...». Такім чынам ясна, што сяньняшняя беларуская мова, не была ў Літве (цяпер Беларусі) чужой, а роднай мовай народу ад Берасьця да Ржэва і ад Вільні да Бранска. Гэта нацыянальна-дзяржаўная мова тых шасьці спародненых плямён, якія ўтварылі такую магутную дзяржаву, якой была ў сярэдніх вяках Літва (Беларусь).

Аргумэнт, што беларуская дзяржава не патрапіць утрымацца бяз мора, а таму, жадаючы карыстацца доступам летувісаў, мы мусім быць ім уступчывымі, не вытрымоўвае найменшае крытыкі. Нам вядома, што славакі, чэхі мадзяры, аўстрыйцы ды другія народы ня мелі і ня маюць доступу да мора, але іхняя жыцьцёвая ступень была вышэйшай ад тых народаў, якія яго мелі. Морам жа яны карысталіся без уступкі сваіх тэрыторыяў. Як бачым, багацьце і дабрабыт народу не залежаць ад мора, але ад таго, як народ у сябе гаспадарыць. Да таго патрэбна памятаць, што мы, беларусы, маем гістарычнае права да Усходняе Прусіі, якая ўваходзіла, як пакрэўнае нам славянскае племя, у склад нашай дзяржавы. Дзякуючы блізарукасьці польскага князя Конрада Мазавецкага, Прусія сілай аружжа была заваявана крыжакамі. Бальшыня яе жыхароў пакінула родную зямлю ды перасялілася ў нашую Бацькаўшчыну-Літву, каб пазбавіцца над сабой паняволеньня. Сяньня тэрыторыя Усходняй Прусіі заселена бальшавіцкім урадам беларусамі. Хто ведае, мо шмат з патомкаў калішніх прусакоў пасьля 7-мі вякоў вярнуліся на зямлю сваіх прадзедаў?

Дык вось, доступ да мора мы маем і стварылі нам яго нашыя ворагі; ён будзе наш, калі над вольнай Баларусяй разаўецца бел-чырвона-белы штандар незалежнасьці.

Што да здабываньня сымпатыяў другіх народаў, дык мы можам запэўніць летувісаў у тым, што сымпатыі ўсіх наро-

даў, якія любяць волю сваю і паважаюць волю другіх, ёсьць заўсёды на нашым баку хоць бы таму, што наш народ вядзе змаганьне ў імя праўды і свабоды, што праданы і разграблены, ён ня склаў аружжа, а ў працягу цэлых стагодзьдзяў вёў няроўную барацьбу за сваю незалежнасьць, за тое, каб ягоная ўраджайная глеба не служыла рассаднікам чужога, варожага племя. Да народу ж мучаніка ды героя мусіць мець пашану ня толькі прыяцель, але натват і вораг. Калі б мы здрадзілі традыцыі сваіх слаўных продкаў люцічаў-вялетаў і іншых ды аддалі адвечную нашу зямлю, усеяную іхнімі касьцямі, мы страцілі б сымпатыі ня толькі прыяцеляў, але нават і ворагаў.

«Траянскі конь», падстаўлены ў 1939 годзе бальшавікамі Летуве ў постаці нашай Вільні, для здабыцьця іхніх сымпатыяў, ня толькі не навучыў летувісаў, хоць за яго яны страцілі сваю бацькаўшчыну і волю, але разлакоміў іх апэтыты. Але ня трэба забывацца, што бальшавікі здабывалі сымпатыі летувісаў ня коштам расейскай зямлі са сталіцай ўключна, але нашай, беларускай, да якой яны ня мелі і ня маюць ніякага права. Патрэбна памятаць, што ўсялякі бяспраўны падзел здабытку са злачынцам зьяўляецца злачынствам.

Згаджаемся з зацемкай летувіса, што нашая нязгода аслабляе агульны супрацьбальшавіцкі фронт, але дадаем, што ў імя згоды патрэбна зрачыся шавіністычных, неабаснованых дамаганьняў. Мы, беларусы, ня можам і ня маем права ў імя згоды для перамогі над адным акупантам аддаць нашых братоў у няволю «прэтэндантам» на акупантаў. Маем гонар запэўніць, што ў імя дабрабыту свайго народу, у імя слаўных ягоных традыцыяў мы, беларусы, будзем бараніць ня толькі адвечную сталіцу Вільню, але і кожны, зьліты кроўю і потам нашых дзядоў, родны беларускі загон.

У імя Навукі Хрыста мы падамо па-брацку руку ня толькі летувісам, якія сяньня капаюць пад намі яму, але і тым, хто нас гнобіў у працягу вякоў з засьцярогай, што яны нам дакажуць на справе пашану да нашага права на вольнае й незалежнае існаваньне.

Народ, які даў зь сябе столькі вялікіх геніяў чужынцам (як палякам, так і маскалям), ніколі ня згіне, але патрапіць даць зь сябе вялікіх людзей і Роднаму Краю. Гэта ўжо назіраецца: Купала, Багдановіч, Колас, Танк.

Баяцца нашы суседзі адраджэньня Беларусі, нешта ў гэтым яны прадчуваюць. Можа, чуюць абуджэньне духу «грозных палачанаў» ды вялетаў-люцічаў? Як бы яно ні

было, мы пэўныя, што Беларускага Нацыянальна-Вызвольнага Руху не ўстрымае ніякая варожая сіла.

Я. Люціч-Воўк

№ 8, 1949 г.

РУСІФІКАЦЫЯ БЕЛАРУСІ

Нельга ўявіць сапраўднага патрыёта, які б ня ведаў свайго Краю. І добрае, і дрэннае, усё, што дзеецца на Бацькаўшчыне, ня можа быць абыякавым для таго, хто любіць яе. Безумоўна, заўсёды прыемней даведацца нешта добрае і суцяшаючае аб сваёй краіне, але нельга заплюшчваць вачэй на сумныя факты. Тут якраз маем на мэце адно з застрашаючых зьявішчаў, якое цяпер лютуе на Беларусі — гэта русіфікацыя. Праўда, Беларусь з гэтага гледзішча ня ёсьць выняткам, ва ўсіх падсавецкіх краінах расейская мова заведзена ў школе, як абавязковы прадмет выкладаньня, і ўжо ў такой краіне, як Мадзяршчына, сёлета адчынены Інстытут марксізму-ленінізму з выкладоваю моваю толькі расейскаю, а ў Беларусі русіфікацыя распачалася значна раней.

Афіцыяльна запачаткаваўся супрацьбеларускі наступ у БССР ад 1930 г., ад часу разгрому т. зв. нацдэмаўшчыны. Гэта быў час масавых арыштаў беларускіх дзеячоў, час нішчэньня сапраўды беларускае літаратуры і беларускае мовы. Цяпер русіфікацыя беларускае мовы йдзе далей і прымае такія формы, што, напрыклад, мова «беларускіх» савецкіх газэт і часапісаў стаецца нейкаю трасянкаю зрасейшчаных і беларускіх словаў. Відаць дзеля гэтага вось ужо шэсьць гадоў Акадэмія навук БССР ня можа выдаць беларуска-расейскага слоўніка, хоць ён ужо ў 1948 г. быў гатовы да друку. Адначасна цяпер адрацоўваецца праект новага правапісу беларускае мовы.

Праўда, яшчэ афіцыяльна існуе шмат газэт і часапісаў у беларускай мове (хоць і зрусіфікаванай). У 1951 г. паведамлялася, што ў БССР ёсьць 10 рэспубліканскіх, 12 абласных, 174 раённых, 122 палітаддзельскіх і 20 галіновых газэт (разам 328) і 10 часапісаў у беларускай мове, але колькі ў іх ёсьць беларускасьці, а колькі расейскасьці, можна бачыць хоць бы з артыкулу, надрукаванага ў «Зьвяздзе» (№ 43 (9155) за 20.II.1952 г.), — «Шматвяковая дружба і супрацоўніцтва

рускага і беларускага народаў», дзе гаворыцца: «Вялікі рускі народ — найбольш выдатная нацыя і кіруючая сіла Савецкага Саюзу — заўсёды адыгрываў рашаючую ролю ў гістарычным лёсе беларускага народу». Ці трэба паясьняць яшчэ гэты сказ?!

Выданьні Акадэміі Навук БССР робяцца амаль выключна ў расейскай мове. Выклады ў Менскім унівэрсытэце, а таксама ў іншых ВНУ, адбываюцца амаль выключна парасейску. Прафэсарскі склад акадэміі Навук БССР і Унівэрсытэту пераважна расейскі. Каб ня быць галаслоўным, падаём сьпіс акадэмікаў БССР — самі прозьвішчы кажуць аб нацыянальнасьці тых, хто іх носіць.

Пэрсанальны склад акадэмікаў у 1952 г.:

Купрэвіч Васіль Феафілавіч — прэзыдэнт, Азаранка Е. К., Акімава О. Д., Атраховіч К. К. (Крапіва К.), Аляксееў Б. К., Барысенка В. — дырэктар Інстытуту літаратуры і мастацтва, Барсток М. Н., Безбародаў М., Вінбэрг Г. Г., Вяршэня С. М., Вятохін І. А., Гарагляд Х. С. — дырэктар Інстытуту жывёлагадоўлі, Годнеў Т. Н., Гораў В. К., Губкін С. І., Дарожкін Н. А., Драко М. М., Язубчык А. А., Ярафееў Б. В., Жэбрак А. Р., Калішэвіч С. В., Караткоў К. Н., Кедраў-Зіхман О. К. — дырэктар Беларускай дзяржаўнай сэлекцыйнае станцыі, Колас Якуб (Міцкевіч) — віцэ-прэзыдэнт, Лапо А. І., Ляонаў В. А., Лупіновіч І. С., Маргунскі С. П., Маркавец А. Ф., Маркаў Д. А., Мацэпура М. Я., Нікольскі М. Н., Пераход В., Перцаў В. Н., Патапаў М. В., Пракапчук А. Я., Пшыркоў Ю. С., Пятровіч П. Г., Рагавой П. П., Сьвірычэўская М. М., Сарокін А. А., Старавойтаў В. І., Сяржанін І. Н., Томін М. П., Цярэньеў В. М., Чымбург І. С., Шэмпель В. І., Юньеў Г. С., Ярмоленка Н. Ф., Юскавец М. К.

Яшчэ больш небеларускі прафэсарскі склад Беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту ў Менску з рэктарам І. Чымбургам на чале. Там пераважаюць прафэсары з такімі прозьвішчамі, як Савачкін, Эльбэрт, Рагозін і пад.

У сярэдніх і народных школах таксама сустракаецца вялікая колькасьць расейцаў, ня кажучы ўжо аб тых тысячах чыста расейскіх школаў, дзе расейская мова ёсьць усеўладнаю афіцыяльна. Варта ўвагі, што цяпер у савецкіх справаздачах аб школьніцтве ў БССР не ўспамінаецца зусім, колькі ёсьць беларускіх і колькі небеларускіх школаў — відаць, між імі розьніца заціраецца і ў тэорыі, і ў практыцы.

Побач школьніцтва вялікі ўплыў на народ мае тэатр. Вось жа і ў гэтай галіне ў БССР справа вельмі характэрная. У Менску ёсьць Тэатр опэры і балету, Расейскі драматычны тэатр і Беларускі драматычны тэатр. Няма дзіва, што ў Расейскім тэатры пераважаюць расейцы, але пагляньма на склад Беларускага тэатру опэры і балету: дырэктар — М. Шнайдэрман, балетмайстры, балерыны і мастакі: Л. Александроўская, Л. Аляксеева, І. Балацін, А. Бельскі, В. Вайконэн, В. Валчанецкая, Варгін, Э. Васільева, М. Варвулёў, М. Вітольбэрг-Марцыянава, М. Дзянісаў, С. Друкэр, С. Дрэчын, Р. Кіндэль, Д. Кроз, Н. Лазараў, Л. Любімаў, В. Малькова, П. Масьленікаў, П. Мільчына, Р. Млодэк, К. Мулер, І. Мурамцаў, А. Мікалаева, С. Мікалаеў, Т. Ніжнікаў, Б. Пакроўскі, Е. Прысёлкаў, Н. Туроўскі, Е. Розэнблят, І. Саніна, Сысоеў, Н. Сярдобаў, В. Талокін, О. Фурс, К. Ціхаміраў.

Між артыстамі Беларускага драматычнага тэатру ў Менску спатыкаюцца часьцей беларускія прозьвішчы, але не нашмат.

Гляньма між кампазытараў БССР — таксама пераважаюць прозьвішчы на -оў:

Аладаў, Багатыроў, Яфімаў, Жыновіч, Залатароў, Іпалітаў, Камінскі, Крошнер, Лапаціна, Лукас, Любан, Алоўнікаў, Арленін, Падкавыраў, Прохараў, Пукст, Сакалоўскі, Цікоцкі, Цітовіч, Чуркін, Шырма, Эвальд.

Цяпер пройдземся вуліцамі беларускіх гарадоў. Толькі ў меншых мястэчках можна часьцей пачуць на вуліцах беларускую мову, у большых, звычайна, чуецца «обшчэпонятная» мова. Надпісы на крамах і прадпрыемствах таксама на чысьценькай маскоўскай мове павыпісваны. Розныя плякаты і клічы — тое самае. Але прыгляньмася да назоваў саміх вуліц. Вось для прыкладу важнейшыя вуліцы, пляцы і перавулкі сталіцы Беларускае ССР — Менску:

Абутковая, Адзінаццатага Чэрвеня, Акадэмічная, Апанскага, Арцельная, Асвабаджэньня, Бабруйская, Батарэйная, Берасьцянская, Берсана, Бранявы перав., Брылеўская, Вайсковы перав., Вакзальная плошча, Валадарскага, Ванеева, Варашылава, Ватуціна, Вольная, Вузаўская, Галянтарэйная, Гвардзейская, Горкага Максіма, Грушаўскі пасёлак, Грушаўская, Дабрамысьленская, Дзяржынскага, Даўгабродзкая, Даўгінаўскі тракт, Дамашэўская, Жалезнадарожны перав., Завадзкая, Заслаўскі перав., Заслонава, Захарава,

Інтэрнацыянальная, Калінінградзкая, Каменная, Карла Маркса, Кастрычніцкая, Кірава, Кладбішчэнская, Клубная, Камсамольская, Камунальная, Круглая плошча, Кузьнечная, Куйбышава, Лагойскі тракт, Ленінская вул. і бульвар, Ленінская плошча, Лінейны перав., Луначарскага, Магілёўская, Магілёўская шаша, Маскоўская, Міхайлаўская, Мопраўская, Мясьнікова, пл. Нагіна, Новаўфімская, Няміга, Аранскага, Падлесная, Першамайская, Прывакзальная пл., Пушкіна, Рабочы перав., Радыстаў, Разіна, Рэвалюцыйная, Савецкая, Свабоды пл., Сталінградзкая, Стара-Віленская, Старажоўская, Стралковая, Сьвярдлова, Талстога, Ульянаўская, Урыцкага, Усходняя (Восточная), Флёкса, Фрунзэ, Харкаўская, Ціхая, Цнянская, Цэнтральная пл., Чырвоная, Чырвонаармейская, Чырвоназьвёздная, Чычэрына, Чэрвеньскі тр., Чэрняхоўская, Шорная, Шчарбакова, Шырокая, Энгельса, Янкі Купалы.

Вось жа акрамя вуліцы Янкі Купалы, усе назовы вуліц ёсьць чужымі для Беларусі, пераважна бальшавіцка-расейскімі. У іншых беларускіх гарадох назіраецца тое самае зьявішча.

Загляньма на прадпрыемствы, хто іх ачольвае? Аўтапрамбуд — дырэктар Дурноў, Белтрактарбуд — Башурын, Трактарны завод — Тарасаў, Стальканструкцыя — Калінін, Глаўпрамбуд — Паперно, Белзаготбуд — Пахомаў, Беларусьэнэрга — Бацьвіньнік, Белгастанкабуд — Іцкаў, Інструмэнтальны завод у Менску — Ермакоў, Будтрэст — Сапракоў, Легпрамбуд № 2 — Левін, Мелянжавы камб. — Афанасьеў, Белптушкатрэст — Карпенка, Белхаладбуд — Васільеў, Маслабаза — Астромецкін, Агравальнага аснашчэньня і трубаў завод — Валодзін, Вялільна-войлач. фабр. — Казаноў, галоўны інж. Гіпсавага зав. у Менску — Куратнікаў, галоўны інж. Мэталюрг. камбінату ў Магілёве — Мэерсон, Белгалаўспірт — Барэнаў… І так усюды, рэдка дзе спатыкаецца беларускае прозьвішча на кіруючых становішчах.

Адкуль жа йдзе такі наступ? На гэтае пытаньне няма патрэбы адказваць. Ясна, што ўсё гэтае чужое йдзе на Беларусь з чужога і варожага краю. Але пытаньне гэтае зразумелае, бо савецкая прапаганда трубіць на ўвесь сьвет, што ва ўсіх рэспубліках СССР сам народ мае ўладу, кожны народ мае поўную свабоду і сам кіруе па-дэмакратычнаму сваім жыцьцём. Здаецца, што больш хлусьлівага цьверджаньня, як гэтае, няма ў сьвеце, бо тая самая прапаганда, толькі пры іншых нагодах, бессаромна выяўляе, што сапраўды кіруе ўсім жыцьцём у кожнай падсавецкай краіне камуністычная партыя, а партыяю кіруе Сталін. З гэтага гледзішча ёсьць вымоўным асабовы склад камуністычнае партыі і камсамолу БССР. У 1952 г. ён быў такі:

ЦК ВКП(б)Б		ЛК СМБ (Ленінска-камуністычны Саюз моладзі Беларусі)	
Патолічаў Н. С.	першы сакратар	Машэраў П. М.	першы сакратар
Зімянін М. В.	сакратар	Данілава Л. А.	сакратар
Гарбуноў Ц. С.	сакратар	Позняк Р. Т.	сакратар
Ганенка І. П.	сакратар	Цярэня В. Н.	сакратар
Абросімаў П. А.	сакратар	Аблова Р. Т.	сакратар
Казлоў В. І.	сакратар		

Спускаючыся ніжэй па ерархічнай драбіне камуністычнае партыі, у гаркамах і райкамах можна час ад часу стрэнуць беларускія прозьвішчы сакратароў, але іх вельмі мала — пры тым усе яны зьяўляюцца толькі паслушнымі выканаўцамі Цэнтральнага Камітэту партыі.

Пры гэтай нагодзе нельга ня ўспомніць і таго факту, што дзейнасьць Праваслаўнай Царквы на Беларусі вядзецца выключна ў расейскім духу і ў расейскай мове. Душпастырскія курсы, якія адбываліся ў Менску, Горадні і Пінску, вяліся ў расейскай мове, і сьвятары мусілі здаваць іспыт з расейскае мовы, аб беларускай і гутаркі не было. Выклады ў Духоўнай сэмінарыі ў Жыровічах адбываюцца па-расейску. Сучасныя ерархі на Беларусі ўсе без вынятку расейцы: менскі — арх. Піцірым Свірыдаў, гародзенскі і берасьцейскі — яп. Сергій Ларын, пінскі — яп. Паісій Абразуеў, віленскі — яп. Фоцій Тапіра, смаленскі — яп. Сергій Сьмірноў. Іншыя епархіі зусім пустуюць, пустуюць таксама ўсе каталіцкія дыяцэзіі на Беларусі.

Вобласьці	Прозьвішчы першых сакратароў абкамаў КП(б)Б	Прозьвішчы першых сакратароў абкамаў ЛКСМБ
Бабруйск	Багданаў Р.	Архіпаў В. І.
Баранавічы	Пакроўскі Н. П.	Пілатовіч С. А.
Берасьце	Сіляеў Ф. П.	Дударова І. Е.
Віцебск	Палянаў І.	Шабашоў С. М.
Горадня	Радзюк Т. С.	Аксёнаў А. Н.
Гомель	Карлаў	Арлоў Н. І.
Магілёў	Сікорскі Н. І.	Крывулін Г. А.
Маладэчна	Доркін В. Г.	Кляцкоў Л. Г.
Менск	Мазураў К. Т.	Комлік В. П.
Палесьсе (Мазыр)	Лабанок У. Е.	Піліпенка А. І.
Пінск	Мачульскі Р. Н.	Крывашапка В. І.
Полацк	Цябут Д. В.	Нікідарэнка Д. Л.

Але найбольш грозным зьявішчам русіфікацыі Беларусі ёсьць той факт, што дасьледаваньне мінулага Беларусі вядзецца цяпер амаль выключна расейцамі. Калі яшчэ ў 1945 г. дасьледаваньне Гародзенскага замчышча вёў сябра Акадэміі Навук БССР праф. Б. Галубовіч, дык ужо ў 1949 г. гэтыя досьледы прадаўжалі расейцы і жыды пад кіраўніцтвам Н. Вароніна і А. Нікіціна (іншыя супрацоўнікі: В. Янін, Л. Арцішэўская, В. Сядоў, К. Кармішына, А. Рцішчава, О. Вульф, Е. Мясьнікова, Л. Аляксееў, В. Косцін).

Падобнае зьявішча бачым амаль у кожнай галіне грамадзкага жыцьця ў сучаснай БССР. Безумоўна, гэткія зьявы для нас тым больш сумныя, што мы ня маем магчымасьці на эміграцыі, каб ім супрацьставіцца, аднак ёсьць нашым абавязкам падаць іх да агульнага ведама. Мы мусім падаць гэта на суд усяго людзтва — хай знаюць і хай судзяць усе і кожны паасобку расейскі ненасытны імпэрыялізм і хай зра-

зумеюць, што пакуль гэты імперыялізм існуе, датуль на сьвеце ня будзе ані спакою, ані ладу, вечна будуць ліцца нявінныя сьлёзы і кроў паняволеных народаў. Ніводзін народ, які яшчэ сёньня вольны, ня можа быць пэўны, што заўтра не сустрэне яго сёньняшняя горкая доля беларускага народу. І гэтак будзе да тае пары, пакуль не зруйнуюць расейскае турмы, званае СССР, і не дадуць свабоды ўсім прыгнобленым у ёй народам.

Ар-ст

№ 27, 1952 г.

САЦЫЯЛЬНАЯ АФАРБОЎКА БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ

Чытаючы беларускую літаратуру і прэсу, пачынаючы ад Багушэвіча і канчаючы творамі маладых пісьменьнікаў эміграцыі, заўважаем адно дзіўнае зьявішча. Бальшыня іх аўтараў удзяляе шмат месца сацыяльным праблемам, вельмі часта яны адзначаюцца рэвалюцыйным, бунтарскім характарам. Шмат нашых эміграцыйных паэтаў, будучы перакананымі нацыяналістамі, рашучымі ворагамі камунізму і Саветаў, выражаюць скрайна левыя пагляды ў сацыяльных справах. У былой «панскай» Польшчы слова «беларус» значыла «камуніст», а ў камуністычных Саветах яно было сынонімам слова «фашыст». Выглядала б на першы пагляд, што беларус па сваім дзіўным характары зьяўляецца адначасна камуністам і фашыстам. Аднак усім добра ведама, што як камунізм, так і фашызм ёсьць незразумелыя і працўныя натуры беларуса. Калі ж нацыяналізм беларусаў усім лёгка зразумелы, то, наадварот, іх «левасьць», крыніцы і прычыны яе вымагаюць пэўнага вытлумачэньня.

Беларускі народ у часе сваёй дзяржаўнай самастойнасьці падзяляўся на тры асноўныя групы: баяр, мяшчан і сялян. Кіруючая роля грамадзтва належала да баярства. Такі склад нашага народу праіснаваў да XV ст. У XV стагодзьдзі даходзіць да няшчаснай для нас вуніі з Польшчай. З прычыны шматлікіх спробаў зь беларускага боку парваць гэтую вунію Польшча ўсякімі спосабамі старалася асыміляваць Беларусь. Першым этапам гэтага прадпрыемства была палянізацыя нашага баярства і багацейшага мяшчанства — кіруючых пластоў нашага грамадзтва.

З прычыны знанай на ўвесь сьвет анархіі польская шляхта карысталася значна шырэйшымі правамі і прывілеямі, чым беларускае баярства. Гарадзельская ўмова з 1413 г. надае беларускай арыстакратыі поўныя правы польскай шляхты, пад умовай, аднак, што яна мусіць прыняць каталіцызм. Паступова амаль што ўся наша арыстакрацыя, эгаістычна і скваплівa карыстаючы з аказіі, пераходзіць на каталіцызм. Здавалася б, нічога ў гэтым дрэннага не было, бо каталіцызм ёсьць абсалютна нэўтральны ў нацыянальных пытаньнях. Так аднак ня сталася. Справа ў тым, што каталіцкае духавенства на Беларусі было выключна польскім, яно бараніла толькі польскія інтарэсы. У працягу XVI—XVII ст. Край наш пакрываецца густой сеткай польскіх каталіцкіх кляштароў. Беларускія сярэднія і вышэйшыя школы паступова замяняюцца каталіцкімі езуіцкімі дасканала арганізаванымі польскімі школамі, якіх адзінай, бадай, мэтай была рашучая палянізацыя іх гадунцоў. У выніку двустагадовай апрацоўкі нашай арыстакрацыі польскім ксяндзом, манахам і манахам-настаўнікам усё наша баярства і багацейшае мяшчанства — культурна і палітычна вядучыя пласты беларускага грамадзтва — спалянізаваліся і беспаваротна загінулі для нашага народу.

Наступным этапам, які пачала праводзіць Польшча, была палянізацыя нашых народных гушчаў. Беларускі народ быў варожы каталіцызму, бо сваім непамыльным інстынктам бачыў у ім толькі сродак палянізацыі. Тады палякі зрабілі спробу спалянізаваць беларусаў іншым спосабам. У 1596 г. у Берасьці нашаму народу была накінута сілай рэлігійная вунія. Аднак, так як вуніяцкае духавенства было беларускім, вунія ня толькі не прынясла ніякае шкоды, а наадварот, яна сталася нашым нацыянальным веравызнаньнем, адрозьніваючы нас ад палякаў і расейцаў. Такім чынам польскія намеры асыміляцыі беларускіх масаў скончыліся поўнай няўдачай.

Пасьля падзелу Польшчы ў канцы XVIII стагодзьдзя Беларусь трапіла пад панаваньне Расеі. Расея не аказалася лепшай ад Польшчы, яна пастанавіла яшчэ больш дзікі спосаб русіфікаваць наш край. Русыфікацыя пачалася ад прымусовага павароту беларусаў з вуніі на праваслаўе. З прычыны нялюдзкіх мэтадаў гэтага мерапрыемства шмат беларусаў пераходзіць не на праваслаўе, але на каталіцызм, дзе пад уплывам польскага духавенства палянізуецца і прападае для нашай справы. Адначасна Расея калянізуе наш Край сваімі праваслаўнымі духоўнікамі, настаўнікамі і ўрадоўцамі. У выніку гэтай палітыкі пэўная колькасьць нашай арыстакрацыі русіфікуецца. Аднак, падобна як і палякі, не змаглі расейцы зрусіфікаваць беларускіх народных масаў, якія захавалі сваю нацыянальнасьць і культуру.

Такім чынам у XVI—XIX ст. на Беларусі запанавалі наступныя ненармальныя грамадзкія, эканамічныя і нацыянальныя адносіны. Кіруючы пласт народу, які адначасна зьяўляўся ўласьнікам 3/4 багацьцяў краіны — арыстакрацыя — стаўся чужым і варожым для беларускасьці, бо ён быў польскім або расейскім. Гэты варожы элемэнт вельмі жорстка эксплюатуе чужое яму беларускае насельніцтва. Сацыяльная несправядлівасьць і палітычны перасьлед яшчэ больш з'адзіночваюць наш народ.

Ідэі Вялікай Французкай рэвалюцыі, якая цьвердзіла, што ўсе людзі родзяцца роўнымі і маюць роўныя палітычныя і сацыяльныя правы, пранікаюць паволі ў беларускі народ, усьведамляюць яго аб канечнасьці барацьбы за свае сацыяльныя і палітычныя правы. Так як палітычны ўціск паходзіў ад чужога элемэнту, паўстаюць нацыянальнае пытаньне, нацыянальны рух, нацыянальная барацьба. Такім чынам беларускі нацыянальны рух на самым пачатку свайго існаваньня вельмі цесна, неразрыўна зьвязваецца з сацыяльнай барацьбой.

Пад уплывам успомненых вышэй ідэяў і моднага ў тым часе Рамантызму, які цікавіўся мінуўшчынай, сьвятлейшыя і лепшыя адзінкі нашай былой арыстакрацыі вяртаюцца да беларускай нацыянальнасьці і пачынаюць больш ці менш актыўна працаваць на карысьць свайго народу. Гэту новапаўсталую беларускую арыстакрацыю, якая, на вялікі жаль, была вельмі нешматлікай, можна падзяліць на дзьве групы. Першая з іх усьведамляе сваю беларускую нацыянальную прыналежнасьць, карыстаючыся з набытых правоў і прывілеяў, працуе на нацыянальнай ніве, але ў сацыяльных справах не бароніць і не ўсьведамляе свайго народу. Літуючыся над нядоляй народу, пісьменьнікі гэтай групы пішуць беларускія вершы і песьні, у якіх пацяшаюць народ і, як ім здаецца, гэтым аблягчаюць яго цяжкае існаваньне. Прыкладам такіх паэтаў могуць служыць Чачот і Марцінкевіч.

Іншая група, носячая больш рэвалюцыйны характар, працуе ня толькі на нацыянальным грунце, але, насуперак

сваім клясавым інтарэсам, рашуча змагаецца за сацыяльную справядлівасьць для свайго народу. У творах, пісаных простай і зразумелай мовай, яны ўсебакова ўсьведамляюць народ і заклікаюць яго да змаганьня за свае прыродныя правы. Можна нават сказаць, што вельмі часта яны ўдзяляюць больш месца сацыяльным пытаньням, чым чыста нацыянальным праблемам. Тыповым і найбольшым прадстаўніком гэтае групы зьўляецца «бацька беларускага адраджэньня» Ф. Багушэвіч (1840—1900); усё яго жыцьцё было прысьвечана ўспомненай вышэй справе. Адначасна, можа за іх прыкладам, або і ў выніку самаахвярнай працы гэтых людзей, паяўляюцца шматлікія народныя дзеячы і пісьменьнікі, якія перажываючы самі нядолю нашага народу, становяцца яго паўнацэннымі прадстаўнікамі і абаронцамі. Першым зь іх быў П. Бахрым (1805—1891), які ў сваёй паэзіі аплаквае жудасныя зьдзекі над беларускім сялянствам.

У другой палавіне XIX ст. новыя сацыяльныя ідэі пашыраюцца на Беларусі і знаходзяць вельмі падатны грунт, бо да сацыяльнага гнёту далучаўся нацыянальны перасьлед. У выніку гэтых абставін успомненыя ідэі праявіліся больш у магутным нацыянальным уздыме, чым у чыста клясавай барацьбе. Ужо ў 1862 г. выходзіць першая нелегальная беларуская газэта «Мужыцкая праўда»; у 1881 г. беларус Грынявіцкі забівае цара Аляксандра II і сам гіне; а ў 1902 г. паўстае Беларуская Рэвалюцыйная грамада. Сярод беларускіх пісьменьнікаў таго часу паўстае цэлая група т.зв. «пралетарскіх» пісьменьнікаў, у якіх рэвалюцыйны элемэнт, скіраваны супроць расейскага самадзяржаўя, стаяў на першым пляне. Прадстаўнікамі гэтай групы зьяўляюцца Цётка і Цішка Гартны.

На пачатку XX ст. нацыянальны рух ахапіў дасьлоўна ўвесь народ. Расейскі ўрад змушаны быў дазволіць беларускі друк. У 1906 г. пачала выходзіць першая легальная беларуская газэта «Наша доля», якая хутка замяняецца «Нашай нівай», што рэгулярна выходзіць да 1916 г. Каля гэтай газэты, якая кіруе ўсім нацыянальным рухам, групуюцца ўсе нашыя пісьменьнікі, палітычна-нацыянальныя дзеячы і наагул уся наша інтэлігэнцыя. Пісьменьнікі т. зв. «нашаніўскага» пэрыяду, зь якіх найвыдатнейшымі былі Купала, Колас, Гарун і Багдановіч, ва ўсіх сваіх творах змагаюцца за сацыяльныя і палітычныя правы беларускага

народу, усе яны зьяўляюцца рэвалюцыянерамі, але заўсёды нацыянальнае пытаньне ў іх стаяла на першым пляне. Кіруючы орган сучаснага нацыянальнага руху «Наша ніва» тлумачыла народу, што ён быў жорстка эксплюатаваны і што яго эксплюататарамі былі чужынцы. Гэтая газэта і ўся беларуская літаратура сьцвярджалі, што ўсе сацыяльныя несправядлівасьці могуць быць пакананы толькі праз здабыцьцё нацыянальнай і палітычнай незалежнасьці. Такім чынам нацыянальнае змаганьне пакрывала сабой барацьбу за сацыяльныя правы. Гэтым і тлумачыцца буйны росквіт нацыянальнага беларускага руху на пачатку нашага стагодзьдзя.

У 1921 г. Беларусь была падзелена паміж Саветамі і Польшчай. У БССР пытаньне сацыяльнай барацьбы практычна адпала, бо там матэрыяльныя ўмовы жыцьця, будучы вельмі цяжкімі, не былі горшымі ад умоваў, пануючых ва ўсёй савецкай імпэрыі. Аднак Край наш надалей заставаўся ў расейскай няволі і цярпеў жорсткі нацыянальны перасьлед. З прычыны спэцыфічных умоваў савецкай рэчаіснасьці ўвесь высілак гэтай часткі Беларусі канцэнтраваўся на нацыянальнай барацьбе, якая каштавала сотні тысячаў ахвяраў найлепшых сыноў нашай Бацькаўшчыны.

Іначай прадстаўлялася справа ў Заходняй Беларусі пад польскай акупацыяй. Там беларускія сяляне душыліся ад беззямельля ў той час, як лясы і трэцяя частка зямлі належала да польскіх абшарнікаў, каляністаў дзяржавы. Беларусам было забаронена купляць зямлю, займацца гандлем, быць урадоўцамі, вучыцца ў некаторых сярэдніх і вышэйшых школах. Беларускія школы і розныя арганізацыі былі ліквідаваныя. На гэтых землях не будавалася ніякай прамысловасьці. Польшча штучна арганізавала эканамічны крызыс, каб ім задушыць нацыянальны рух нашага народу. Дык ня трэба дзівіцца, што Беларуская Сацыялістычная Грамада, якая паўстала ў 1924 г., ахапіла сваёй дзейнасьцю ўвесь Край. Праўда, палякі сілай здушылі Грамаду, запоўніваючы турмы беларусамі, але гэтым яны не здушылі нашага нацыянальна-сацыяльнага руху. Пазьнейшыя падзеі добра іх аб гэтым пераканалі.

Нават павярхоўны перагляд нашай гісторыі паказвае, што шматвяковае змаганьне беларуса за існаваньне і волю вытварыла ў ім рэвалюцыйны і глыбока нацыяналістычны характар. Так як асягненьне сацыяльнай справядлівасьці

ёсьць магчымым толькі пасьля здабыцьця нацыянальнай самастойнасьці, кожны беларускі сацыяліст і рэвалюцыянер (як ні парадаксальна гэта выглядае) мусіць быць адначасна нацыяналістам. Наш сацыялізм служыў, служыць нацыяналізму і наадварот. Гэтыя два процілеглыя і ў нармальных умовах наўзаем выключаючыя напрамкі на Беларусі былі і застаюцца неразрыўна паміж сабой зьвязаныя — твораць адно цэлае.

Зразумела, што зьявішча «левасьці» беларускага нацыянальнага руху, а нават і ўсяго нашага народу, не зьяўляецца нейкай спэцыфічнай рысай нашага характару, а зьявішчам часовым, абумоўленым яго гісторыяй. З момантам здабыцьця самастойнасьці Беларусі наш народ сам упарадкуе свае сацыянальныя справы. У той час усякі сэнс масавай «левасьці» беларускага народу перастане быць актуальны і сам сабой адпадзе.

Эмігрант

№ 21, 1951 г.

ДЭЗАРЫЕНТАЦЫЯ?

Вельмі часта даводзіцца чуць, што некаторыя асобы зусім здэзарыянтаваныя сяньняшнім станам нашага эміграцыйнага жыцьця. Яны цьвердзяць, што дзякуючы разладу, які бачны ў нашых радох, бязрадна апускаюць рукі. Вось жа хочам разгледзець як найбольш аб'ектыўна ды паказаць нашаму грамадзянству, асабліва моладзі, сапраўдны стан рэчаў. Судзіць мы не зьбіраемся нікога, бо ня маем на гэта права, гэта зробіць наш народ. Нашым абавязкам ёсьць прыпомніць аб грамадзкіх абавязках, аб якіх мы часта забываемся, ужываючы сваю энэргію і сілы на сваркі ды падзел. Няхай нікому не падумаецца, што мы не зацікаўлены нашай агульна-грамадзкай справай, не, — якраз дабро гэтае справы змушае нас гэтак падходзіць да яе, бо ведама нам, што крыкам ды нападамі нічога пазытыўнага не асягаецца.

Як ні сумна, але мусім прызнаць факт, што нашае грамадзянства падзелена на дзьве часткі. Нічога страшнага ў гэтым не было б, калі б абедзьве яны мелі адзіны праўдзівы найвышэйшы ідэал — Незалежнасьць нашае Бацькаўшчыны-Беларусі. На жаль, гэтага не назіраецца, бо ўжо адзін факт, што знайшліся людзі, якія павялі наш народ да падзелу, яскрава сьведчыць, што ім не ляжыць на сэрцы дабро народнае, а толькі свая амбіцыя ды сваё становішча. Я асабіста нічога ня маю супраць сп. Радаслава Астроўскага, наадварот, прызнаю, што ў свой час, будучы прэзыдэнтам БЦР, ён зрабіў шмат карыснага для нашага народу. Аднак ад таго часу сталіся вялікія зьмены, якія яго заставілі на пэўны час маўчаць. А сяньня сп. Р. Астроўскі забыўся аб гэтых зьменах і дзейнічае на шкоду агульнае беларускае справы.

Паводле нашага сялянскага розуму, прэзыдэнт выражае волю народу навонкі, але ўнутры ня ён дыктуе народу належны шлях, а народ яму. Зразумела, што ні адзін народ не захоча мець сабе прэзыдэнта, які для яго будзе цяжарам. У нашай гісторыі мы маем шмат павучальных прыкладаў, калі кіраўнік княства ці ўдзелу, не адказваючы народу, зьмяняўся воляй гэтага ж народу на вечы другім, больш адпавядаючым грамадзтву. Веча нас павучае, што не народ прыстасоўваўся да свайго кіраўніка — князя, намесьніка і т. п., але гэтыя апошнія — да народу. Сяньня ж мы бачым зусім іншае. Кожны з нас, як і сам сп. Р. Астроўскі, прызнае слушнасьць, што ягоныя выступленьні не нясуць нічога пазытыўнага нашаму народу, акрамя аслабленьня нашых радоў між намі ды беларускай справы перад чужынцамі. Аднак бачым, што сп. Р. Астроўскага не цікавіць дабро нашага народу, бо інакш ужо толькі тое, што сяньня ён ніякім спосабам ня можа кіраваць нашай справай на міжнародным форуме, дзеля ведамых нам прычынаў, павінна было б змусіць яго зайсьці ў далёкі цень. Нам ведама, што людзі якія былі ў падобным становішчы, і якія для свае бацькаўшчыны зрабілі беспараўнальна больш, чым сп. Р. Астроўскі, сёньня засуджаныя на пасьмертную вязьніцу (маршал Пэтэн). Мусім прызнаць, што да гэткага кроку, які варта зрабіць сп. Р. Астроўскаму, патрабуецца сапраўды глыбокі патрыятызм, ахвярнасьць, ды наагул, трэба быць абдароным па волі Усемагутнага глыбокай душой. Аднак гэтыя бясцэнныя якасьці, як бачна з фактаў, чужыя сп. Р. Астроўскаму, які ня толькі кампрамэтуе сябе ды робіць зло свайму народу, але і выказвае сваю палітычную няграматнасьць.

Накіданьне волі народу — ня нашая традыцыя, але, як бачна, запазычаная сп. Р. Астроўскім у нашага суседа, дзе народ, забыўшыся на чалавечую годнасьць, гнуў сьпіну пе-

рад усялякімі чалавечымі вырадкамі, якія вядомы нам і гісторыі пад імёнамі «грозных», «сатрапаў», зарахоўваючы сюды і сяньняшняга «бацьку» народаў. Ужо толькі таму, што гэты прынцып ня наш, а чужы і з корня варожы нашаму народу, мы, беларусы, павінны адкідаць яго з усёй станоўкасьцю. Нам няведама, як сп. Р. Астроўскі ўяўляе ў цяперашніх абставінах ролю прэзыдэнта БЦР, але ведама, што сяньня яна нічога супольнага з інтарэсамі беларускага народу ня мае. Думаем, што кожнаму лягічна думаючаму беларусу гэта зразумела і ясна, як сонца.

Мы пэўныя, гэта ведае і сп. Р. Астроўскі, што беларускі народ не адрачэцца сваіх тастамэнтаў, свайго адвечнага здабытку, асягненага ў працягу вякоў найбольшай цаной, кроўю лепшых сыноў. Зазначаем, што тастамэнт БНР, у абароне якога мы выступаем, ня ёсьць справаю асобы, якая яго сяньня мае ці заўтра будзе мець, але увасабленьням таго сувэрэнітэту, да якога імкнецца беларускі народ. З хвілінаю асягнення гэтага суверэнітэту, г. зн. у вольнай Беларусі, выбіраць прэзыдэнта будзе сам народ, сяньня ягонае мейсца праўна займае сп. інж. М. Абрамчык, і кожны беларускі патрыёт ня будзе падкопваць ягонага аўтарытэту, бо гэтым самым аслабляе становішча і голас свайго народу. Ужо толькі з пашаны да вялікіх, мучаніцкіх постацяў, якімі былі сьвятое памяці Прэзыдэнты Крэчэўскі ды Захарка, кожны чэсны, любячы свой Край беларус, падпарадкоўваецца іх волі ды сумленна выканае яе, як верны сын выконвае апошнюю волю свайго роднага бацькі. Бо толькі дзякуючы ім, тастамэнт БНР перайшоў іх наступніку ў сваёй крышталь-най чысьціні. Сяньня ануляваць гэты тастамэнт, г. зн. адрачыся ад усіх здабыткаў, ад цярністай дарогі, засланай касьцьмі і зьлітай кроўю нашых папярэднікаў. Адракацца ад тастамэнту, які нам дастаіўся ў спадку, значыць адракацца ад волі народу.

А таму хістаньне ці нерашучасьць не павінны авалодваць ніводным сапраўдным беларусам, бо толькі гэта прычынілася да сяньняншяга стану. Як бачым, ніякі разлад не павінен існаваць, а хвілёвая дэзарыянтацыя ўведзена сьведама злой воляй людзей, якія здабыліся на «цывільную» адвагу выцягваць паплямленыя рукі па чыстую душу беларуса, павінна атрымаць рашучы адпор з боку кожнага патрыёта беларускага народу.

Янка Філістовіч

№ 11, 1949 г.

ДЗЕІ І ЗНАЧЭНЬНЕ БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ

Эміграцыя не зьяўляецца зьявішчам новым, характэрным толькі для сучаснай эпохі. Палягае яна на прымусовым, або дабравольным пакіданьні роднага краю праз пэўныя адзінкі, або цэлыя групы грамадзтва ў пошуках бясьпекі ці лепшай матэрыяльнай забяспечанасьці. Варта пры гэтым зацеміць, што эмігруючыя адзінкі зьяўляюцца, як правіла, найбольш вартаснымі грамадзянамі данага народу. З гэтага гледзішча эміграцыя зьяўляецца найчасьцей вялікім няшчасьцем народу.

У старадаўныя часы Беларусь была самастойнай, багатай дзяржавай і таму аб яе эміграцыі нічога не чуваць у гісторыі. Паложаньне, аднак зьмяняецца, калі наш край трапляе пад акупацыю, калі прагавітыя чужынцы пачалі руйнаваць нашую Бацькаўшчыну і плянава зьнішчаць яе найлепшых сыноў.

Пачаткі масавае беларускае эміграцыі паходзяць з канца XIX і пачатку XX стагодзьдзяў, калі беларускія землі, знаныя перад гэтым зь іх дабрабыту, зьнішчаныя эканамічна расейскім акупантам, не маглі ўжо пракарміць усіх сваіх сыноў. Гэтая першая масавая беларуская эміграцыя мела дабравольны характар. Каля паўтара мільёна беларускіх сялянаў і дробных рамесьнікаў выэміграваля за мора ў пошуках хлеба. З прычыны падняволеньня Краю гэтыя эмігранты былі амаль што няўсьведамлены нацыянальна. За малымі выняткамі, усе яны бясьсьледна расьцярушыліся сярод чужынцаў і беспаваротна прапалі для беларускай справы. Вельмі часта эмігранты гэтай эпохі падаюцца за палякаў або расейцаў, належаць да іх палітычных арганізацыяў. Яны ня толькі не памагаюць сваёй радзіме, але наадварот, вельмі ёй шкодзяць, нясьведама працуючы на карысьць былых або цяперашніх яе ворагаў. Вельмі важным заданьнем сучаснай эміграцыі ёсьць нацыянальнае ўсьведамленьне гэтых абаламучаных суродзічаў, вяртаньне іх з-пад уплываў і «апекі» нашых нацыянальных ворагаў.

Пасьля 1905 году ўзмацняецца беларускі адраджэнскі рух. Нацыянальная сьведамасьць ахоплівае найшырэйшыя гушчы нашага народу, які пачынае ўпарта змагацца за свае нацыянальныя правы і сваю самастойнасьць. 25 сакавіка 1918 г. беларускі народ вуснамі сваіх прадстаўнікоў у Менску абвясьціў Беларусь незалежнай рэспублікай, стварыў

сваю армію і свой урад, прызнаны афіцыяльна дзясяткам суседніх дзяржаваў.

Аднак наш вораг не драмаў. Пераважаючымі сіламі бальшавіцкая Расея акупавала Беларусь і прыступіла да рашучай ліквідацыі нашай дзяржаўнасьці і ўсяго нацыянальнага руху.

Гэты момант зьяўляецца пачаткам другой масавай беларускай эміграцыі, у адмену ад папярэдняе яна была прымусовай, бо палітычнай. Прэзыдэнт Баларускай Рэспублікі і яго ўрад змушаны былі пакінуць родную зямельку, каб за яе межамі прадаўжаць зацятую барацьбу з акупантам. У 1920 г. выбухае Слуцкае паўстаньне, якое пасьля зацятых змаганьняў было таксама пераможана бальшавікамі. Недабіткі паўстанцаў змушаны былі апынуцца на чужыне. Польска-бальшавіцкая вайна за беларускія землі скончылася ў 1921 г. падзелам нашай Бацькаўшчыны на дзьве часткі.

Абодва акупанты пачалі сваё гаспадараньне на нашых землях ад жорсткага прасьледваньня найменшых праяваў беларускага нацыянальнага жыцьця і ад сыстэматычнага нішчэньня беларускіх нацыянальных дзеячоў. Нічога дзіўнага, што беларускі сьведамы элемэнт, будучы ў небясьпецы, змушаны быў пакідаць Бацькаўшчыну, эміграваць у іншыя краіны, каб там далей змагацца з ворагамі. Беларускія эмігранты расьцярушваюцца па ўсім сьвеце, аднак кіраўнічым цэнтрам для іх сталася Прага, месца перабываньня Беларускага Ўраду.

Беларуская эміграцыя злучаецца каля асобы Прэзыдэнта Беларускай Рэспублікі і вядзе вельмі карысную працу, кіруючы нацыянальным рухам на Бацькаўшчыне і ведучы ўпорную барацьбу за правы беларускага народу на міжнародным грунце. У выніку гэтай працы ў большых асяродзьдзях нашай эміграцыі паўстаюць беларускія нацыянальныя камітэты і арганізацыі, друкуюцца беларускія газэты, часапісы, кніжкі.

У часе Другой Сусьветнай вайны Беларусь зьмяніла акупанта — яе занялі немцы. Немцы нічым ня розьніліся ад іншых акупантаў. Беларусь мела стацца нямецкай калёніяй, а яе насельніцтва — крыніцай таннай працоўнай сілы. Будучы варожымі да беларускай дзяржаўнасьці, немцы распачалі сваё панаваньне ад нішчэньня беларускай найбольш дзейнай інтэлігэнцыі і ад масавай дэпартацыі нашага насельніцтва ў Нямеччыну. Аднак з прычыны дрэнных падзеяў на фронце і вельмі разьвітай партызанкі на занятых абшарах, немцы не маглі выканаць усіх сваіх вынішчальных мерапрыемстваў. Беларускі народ вельмі хутка, як заўсёды ў падобных выпадках (што сьведчыць аб яго дасьпеласьці), скарыстаў са слабасьці ворага і ўсільна працаваў ва ўсіх галінах нацыянальнага жыцьця. Сьмела можна сказаць, што гэты рух ахапіў поўнасьцю ўсё наша насельніцтва. Будучыня ацэніць важнасьць і ўсю веліч праробленай нацыянальнай працы ў гэтым кароткім і трагічным моманце нашай гісторыі.

У 1944 г. акупант зноў зьмяняецца — бальшавікі займаюць Беларусь. Частка беларусаў ідзе ў лясы, дзе і да сёньняшняга дня цаной свае крыві змагаецца за лепшую будучыню Краю. Каля паўміліёна нашых суродзічаў апынуліся за межамі Беларусі. Большасьць зь іх, захопленая ва ўсходняй Нямеччыне, узноў трапіла ў бальшавіцкія кіпцюры, напоўніла савецкая турмы і канцэнтрацыйныя лягеры прымусовай працы. У заходніх зонах Нямеччыны знайшлося каля 200 000 беларусаў. Згодна зь няшчаснай Ялцінскай умовай, заходнія аліянты без ніякіх скрупулаў выдалі бальшавіком 140 000 нашых суродзічаў. Лёс іх усім сёньня добра ведамы. Толькі 60 000 беларусаў засталося ў Нямеччыне, адкуль большасьць зь іх выэміграваля ў іншыя эўрапейскія і заморскія краіны.

Матэрыяльные ўмовы жыцьця беларускай сучаснай эміграцыі страшэнна цяжкія. У крывавым поце яна змагаецца за кавалак чэрствага хлеба. Уся наша інтэлігэнцыя на эміграцыі працуе не па спэцыяльнасьці, жыве зь цяжкой фізычнай працы і вельмі часта ў дрэнных умовах.

Аднак, нягледзячы на ўсе гэтыя цяжкасьці, маецца шмат пацяшаючых праяваў у жыцьці сёняшняй беларускай эміграцыі. Злучаная ідэяй службы Бацькаўшчыне, яна не расплылася ў чужацкім моры. Усюды, дзе знаходзяцца беларусы, паўстаюць розныя нацыянальныя камітэты і іншыя арганізацыі, выдаюцца беларускія газэты і кніжкі. Шмат нашай моладзі, зарганізаванай у свае арганізацыі, студыюе на ўнівэрсытэтах. Урэшце, трэба падкрэсьліць з нацiскам, што, нягледзячы на розныя асабістыя перакананьні паасобных беларускіх эмігрантаў, усе яны злучаныя адзінай цэнтральнай арганізацыяй, якой зьяўляецца Сусьветнае Аб'еднаньне Беларускай эміграцыі (САБЭ). САБЭ кіруе ўсёй працай, і гэтым самым ажыцьцяўляецца дапамога Ураду БНР

на эміграцыі ў выконваньні ягоных абавязкаў, якія заключаюцца ў ажыцьцяўленьні акту 25 Сакавіка.

Эміграцыя зьяўляецца ня толькі асабістым няшчасьцем кожнага з нас, але і бядой для нашай Бацькаўшчыны. Аднак кожнае зло зьяўляецца крыніцай неспажытай энэргіі, калі яно перамагаецца. Трэба спадзявацца, што недалёка ўжо тая хвіліна, калі большасьць з нас вернецца на Бацькаўшчыну, якая атрымае ня толькі дасканалых спэцыялістаў з кожнай галіны, валодаючых усімі мовамі сьвету, але перадусім загартаваных у нацыянальнай барацьбе грамадзян.

Трэба лічыцца з тым, што пасьля вызваленьня Беларусі пэўная частка нашай эміграцыі, з тых ці іншых прычын, ніколі ня вернецца на Бацькаўшчыну. Нават у гэтым выпадку пазасталая на чужыне эміграцыя будзе заўсёды вельмі карыснай для народу. Звычайна, такая эміграцыя і яе будучыя пакаленьні, бароняць інтарэсы сваёй далёкай, а часамі ўжо нязнанай для іх Бацькаўшчыны і ствараюць ёй на ўсім сьвеце карысную апінію. Прыкладам гэтага няхай паслужыць дзейнасьць старой польскай, украінскай, расейскай эміграцыі ў Амэрыцы.

Сёньня, калі зноў на сусьветным кругазоры зьбіраюцца цёмныя хмары, мы ня ведаем што з намі станецца. Аднак мы добра ведаем, што беларускі народ не загінуў і ніколі не загіне, бо ён несьмяротны, вечны, таксама як несьмяротным і вечным ёсьць наш абавязак службы Бацькаўшчыне Беларусі.

Эмігрант

№ 19, 1950 г.

НАШЫЯ ЗАДАНЬНІ

Шмат гаварылася ў беларускай прэсе на гэтую тэму, і здавалася б, што паўтарацца ня варта. Аднак, на жаль, мусім прызнаць, што ўсялякія заўвагі адносна нашых заданьняў застаюцца заўвагамі і мала застасоўваюцца ў нашым практычным жыцьці. Разыходзіцца тут аб жыцьці нашай моладзі ў Францыі. Даволі толькі прыгледзецца да яго, каб зразумець, адчуць і пераканацца, што чагосьці бракуе для таго, каб жыцьцё нашае моладзі ў Францыі сапраўды разьвівалася, а не прытухала. Чаго ж бракуе, каб нашае жыцьцё

зрабіць жывым, магутнеючым і адначасна цэнтрам прыцяганьня? Сяньня мы знаходзімся ў стадыі вычаканьня, у стадыі напружаньня, што найбольш вычэрпвае нашыя сілы, наша цярпеньне. Па другое, у нас адчуваецца *брак сапраўды жывой арганізацыі моладзі*. Па трэцяе, нам не хапае *пачуцьця грамадзкай адказнасьці*, грамадзкага выраблення і здысцыплінаванасьці. Даволі толькі падаць адзін факт, каб пераканацца ў гэтым. Мінула два месяцы, як адзін з нашых сяброў, захварэўшы, лёг у шпіталь. Ягонае матэрыяльнае і маральнае становішча пагоршылася. У гэткім выпадку наш сьвяты абавязак падтрымаць беларуса ў бядзе. Здавалася б, што гэта ўсім нам вядомае. Але, дабраўшыся за пару сотняў кілямэтраў туды, дзе ляжыць наш сябра, мы з сумам пераканаліся, што бальшыня сяброў, якія жывуць зь ім у адным дэпартамэнце, ня знаюць аб яго няшчасьці, другія, якія знаюць, гэтак заняты сваімі штодзённамі клопатамі, што забываюцца і аб хворым брату-калегу і аб сваім абавязку.

Той, хто не захоча ці ня зможа здабыцца на высілак у малой справе, ніколі не здабудзецца на яго ў вялікай. Бо чым большай яна будзе, тым больш вымагаецца ахвярнасьці.

Праўда, мусім з прыемнасьцю сьцьвердзіць, што беларуская моладзь глыбока ахвярная і патрыятычная, да меры сваёй сьведамасьці, што зьяўляецца сапраўды велічэзным духовым рэсурсам, аднак гэтых якасьцяў не хапае, калі яны ня зложаны разам у агульна-грамадзкім высілку. Дык жа, не адкладаючы на пасьля, мы павінны стварыць у Францыі *жывую* арганізацыю беларускай моладзі, якая і паставіць сабе за заданьне сцэмэнтаваць нас і прыцягнуць да больш актыўнай грамадзкай працы, прышчапіць нам тыя якасьці, якіх не стае. Ідучы за голасам душы нашай моладзі, за вымогамі, якіх ад нас патрабуе агульна-грамадзкая беларуская справа, ідзецца аб ініцыятыве залажыць Беларускую Незалежніцкую арганізацыю моладзі ды камбатантаў, заданьні якой ужо абгаворваліся вышэй. З гэтаю мэтаю быў разасланы адпаведны заклік да моладзі. Хай жа ня будзе ні аднаго маладога беларуса, якому любы родны Край і дорага ягоная доля, каторы б не прыняў у гэтым сьветлым пачынаньні актыўнага ды жывога ўдзелу!

Пакінуўшы Бацькаўшчыну, мы не на тое прыехалі ў чужыну заняцца выключна сваімі справамі.

Не шукай ты шчасьця, долі
на чужым, далёкім полі
ці за шумным лесам-борам,
за шырокім сінім морам.

Ты ўсё знойдзеш гэта блізка,
там, дзе маці над калыскай
табе песьні напявала,
як малога калыхала.

Гэтак пісаў прарок Беларускага Адраджэньня Янка Купала. Нам прыйдзецца дадаць толькі тое, што будаваньне свайго асабістага жыцьця не павінна перашкаджаць адбудове Бацькаўшчыны. Як жа можа мець шчасьце той, хто адвяртаецца ад Роднай Маці, каб ня чуць ейных сьлёзаў, ня бачыць ейнага гора?!

Памятайма таксама, што мы пакінулі Бацькаўшчыну не для таго, каб аддаць свае сілы і энэргію далёка ў чужыне. Мы павінны дбаць аб добрае імя Беларуса, як на працы, так і ўсюды, адначасна не забываючыся, што мы мусім вярнуцца назад, поўныя сілы — як фізычнай, так і духовай. Як першая рана ці позна вычэрпваецца, так другая — духовая ды маральная сіла, не памірае ніколі, а перадаецца ў спадку пакаленьням. Значыць, доля народу ў значнай меры залежыць ад таго, як высака стаіць ён маральна і духова. Мы мусім зьвярнуць на гэта асаблівую ўвагу, мусім умець вучыцца з гісторыі чалавецтва, зь яе тысячагодніх здабыткаў.

Толькі тады мы зможам выканаць тую велічэзную працу і абавязак перад Бацькаўшчынай, калі мы навучымся ня толькі слухаць, уздыхаць ды спачуваць, але, закасаўшы рукавы, сапраўды па-беларуску, возьмемся за працу для нашай будучыні. Памятайма словы нашай паэткі Ларысы Геніюш:

Не сумуйце, дзецюкі, вясною,
На магілы гледзячы сяброў,
Жалем нашых ранаў не загоіш
І цяжкіх ня скінеш кайданоў.

Не сумуйце, дзецюкі па долі,
Не хілеце гордай галавы,
Бо ня з жалю, толькі з ранаў, з болю,
Воля толькі родзіцца з крыві.

Дарагія браты, калегі, беларуская моладзь! Памятайма, што доля нашага народу ў нашых руках. Будзьма годнымі гэтай сьвятой і вялікай адказнасьці!

Янка Філістовіч

№ 8, 1949 г.

МОЛАДЗЬ — ДУША НАРОДУ

Але край яшчэ ня згінуў,
не пагнуўся яго стан,
і із нас душы ня выняў
ні маскаль, ні польскі пан.

Гэтак пісаў адзін з найбольшых песьняроў беларускае прыроды тады, калі над родным Краем панавала грубая сіла чужацкай няволі, ведамай сваім дэспатызмам царскае Масквы.

Сяньня, як і раней, наш народ церпіць няволю. Для нас, беларусаў, Масква заўсёды застанецца няволяй, якую яна нам прыносіла ў працягу стагодзьдзяў. Розьніцы ад зьмены колеру няволі, якую нясе адвечна варожая да нашага народу дзяржава, для нас няма. Праўда, мусім прызнаць, што сяньняшняя няволя асягнула небывала-жудасных вынікаў, аднак і адпор, стаўлены ёй нашым народам, ня толькі ня гнецца ў «стане», але магутнее і ўзрастае з кожным днём. У сапраўднасьці вышэйсказанага можна пераканацца, прыгледзеўшыся крыху да жыцьця нашай палітычна ды нацыянальна сьведамай эміграцыі, якая па сваёй разнаякасьці прадстаўляе ўсе галіны беларускага грамадства.

Паколькі нас цікавіць жыцьцё і дзейнасьць нашай моладзі ў Францыі, пастараемся коратка разгледзець яе становішча, працу ды актуальныя заданьні на сяньня.

Лік нашае моладзі ў Францыі не сягае высокіх лічбаў, яе нарахоўваецца тут усяго некалькі сотняў, тым ня менш ейная праца мае вялікае значэньне ня толькі ў жыцьці моладзі, але і ў агульна-грамадзкім ды нацыянальным беларускім жыцьці.

Да апошняга часу нашая моладзь у Францыі, на жаль, не была адпаведна арганізаваная, і таму праца, якую можна было праводзіць без асаблівых высілкаў супольнымі сіламі, лажылася на плечы актыўных і самаахвярных адзінак. Аднак гэтаму паложаны канец. Разумеючы неабход-

насьць арганізацыі моладзі ў Францыі, мы заініцыявалі ейны Зьезд, заданьнем якога было прагледзець нашае становішча, нашую мінулую працу ды задзіночыць усе маладыя сілы ў адзін жывы арганізм. Зьезд, які адбыўся 25 Сакавіка 1949 году, узяўшы пад увагу нашае раздробленьне, пастанавіў залажыць Арганізацыю моладзі ды запачаткаваў Беларускую Незалежніцкую Арганізацыю Моладзі (БНАМ) у Францыі. Гэтым сапраўды мы зрабілі вялікі і цьвёрды крок уперад. Толькі, як ужо зазначалася колькікротна, каб нашая Арганізацыя ня была мёртвая, а разрасталася, магутнела й адказвала свайму заданьню, уся беларуская моладзь у Францыі мусіць быць яе актыўнымі сябрамі. Гэтага вымагае вялікае заданьне, узложанае на нас Бацькаўшчынай, народам ды воляй Усемагутнага. Каб выканаць гэтае заданьне, мы павінны шчыльна злучыцца ды крочыць у авангардзе нашых нацыянальна-вызвольных сілаў — сяньня ў нацыянальна-грамадзкай працы, заўтра — у радох яе першых змагароў за незалежнасьць.

У гэтым выпадку ня можа быць месца асабістым абразам ці амбіцыям, бо расходзіцца тут аб агульнае дабро нашага беларускага народу. Усе непаразуменьні мы, моладзь, павінны бесстаронна разьвязваць у рамках свае арганізацыі.

Разумеючы сяньняшняю сытуацыю, мы не павінны пацяшаць сябе ды тлумачыць сваю бязьдзейнасьць цяжкімі абставінамі, у якіх мы нярэдка знаходзімся. Падчас асягненьня жаданае мэты — здабыцьця волі сваёй Бацькаўшчыне — нас не павінны лякаць ці спыняць ніякія перашкоды. Толькі той асягне жаданае, хто здэцыдаваны на ўсё.

Дык хай жа кожны з нас, беларускае моладзі ў Францыі, уступіўшы ў рады БНАМ, чэсна, без нараканьня нясе свой крыж да канца і пакажа, што ягонае сэрца б'ецца ў тахт з сэрцам Народу.

Укладаючы ўсе свае маладыя сілы ў працу для Бацькаўшчыны, мы пакажам, што душа нашага народу — моладзь — не памерла, як не памерла тая справа, у імя якой мы гатовы на найбольшыя ахвяры. Аддамо ўсе сілы дзеля працы ў радох БНАМ, а праз гэта — на аўтар свае Бацькаўшчыны й яе народу.

Янка Філістовіч

№ 10, 1949 г.

СІЛА — У АБ'ЯДНАННІ

Рэфэрат на Зьезьдзе моладзі
(26 сакавіка 1949 г.)

Гісторыя паўтараецца. Не патрэбна быць яе вялікім знаўцам, каб пераканацца ў гэтым. Бачым пастаянныя хвалі прыліву ды адліву і наадварот.

Калі прыглянемся да гісторыі беларускага народу, — пабачым тое ж самае. Першае, што нам кінецца ў вочы, — гэта раптоўнае паўстаньне сільнай і добра арганізаванай дзяржавы нашых продкаў — Літвы. Гэта яе сыны прыставілі кап'ё да варот Масквы, гэта яны разграмілі татарскі наступ на нашую Бацькаўшчыну, дзякуючы іхняму высілку была зламана крыжацкая моц, гэта яны былі «Божым бічом» Польшчы, як выражаюцца самі польскія гісторыкі. Слава ідзе разам з росквітам культурна-асьветніцкага ды грамадскага жыцьця. Але нявечнае было шчасьлівае жыцьцё нашых продкаў. Абставіны змушаюць нашу Бацькаўшчыну пайсьці на зблiжэньне з Польшчай, дзякуючы якому наш народ перанёс тое гора, якое, здавалася б, канчаткова загубіць яго.

У працягу двух стагодзьдзяў змагаўся наш народ за сваю незалежнасьць з польскай «культурнай», калі так можна сказаць, інвазіяй. Аднак паветра, якім ён дыхае, хоць паволі, але сыстэматычна затраўляецца ўдушліва-раскладаючым духам польска-шляхецкага бяспраўя ды сваволі. Разложаная з нутра, у часе найбольшага свайго высілку навонкі, наша Бацькаўшчына слабее і падпадае пад польскую залежнасьць, чаго і дабіваліся палякі ў працягу вякоў. Аднак гэты падбой не змацняе Польшчу, а наадварот, аслабляе яе, бо, страціўшы жывую апору, Польшча, як гнілое дрэва валіцца пад мацнейшым подыхам ветру, траціць сваю незалежнасьць. Гэтакім чынам, нашая Бацькаўшчына з-пад адной няволі — польскай, пападае пад другую — маскоўскую. Ня будзем мы тут пераказваць усіх тых страхоцьцяў, якія давялося перажыць нашаму народу ў гэтай няволі.

Аднак беларускі народ не згінуў. Аб гэтым сьведчыць паўстаньне з Каліноўскім на чале ў 1863 на змаганьне з Масквой за сваю незалежнасьць. Праўда, гэты парыў быў задушаны шматкратна пераважаючай сілай, аднак гэта ня толькі не перашкодзіла развою беларускага незалежніцкага руху, а наадварот, дало яму апошні штуршок, пасля яко-

га беларускі нацыянальны рух затрымацца ня мог, бо вялікай была сіла, даўшая яму напрамак. Толькі дзякуючы чыну Каліноўскага ды яго пасьлядоўнікаў Беларусь была прагалошаная Актам 25 сакавіка1918 году Народнай Рэспублікай.

Дарма, што і гэты высілак удалося зламаць тым жа самым «братам-суседзям». Ягонага духу ды ідэі незалежнасьці зламаць немагчыма, яны заглыбока ўрасьлі ў сэрца кожнага беларуса.

Нягледзячы на тое, што і цяпер наш край церпіць чужацкую няволю, мы сьмела глядзім уперад, бо бачым, што ўся шырокая Беларусь ахоплена полымем помсты, якое з надыходам адпаведнага часу заменіцца ў мора пажару, каторы зьнішчыць на сваёй дарозе ўсе штучныя перашкоды, пастаўленыя ворагамі. Тысячы верных сыноў Беларусі запаўняюць сяньня нашы лясы, каб з надыходам жаданага моманту распачатую справу давесьці да канца.

Разумеючы важнасьць часу, у якім жывём, мы павінны актыўна ўзяцца за працу. Што ж за заданьні ляжаць на нас, выгнанцах, і што мы мусім зрабіць для дабра беларускае справы?

Сабраўшыся сяньня на першы Зьезд беларускай моладзі ў Францыі, мы мусім памятаць, што на нас ляжыць вялікі абавязак, ад якога мы ўхіліцца ня толькі ня маем права, але ня можам. Гэтым абавязкам зьяўляецца самаахвярная праца для будучыні нашага народу, які сяньня церпіць пад найбольш дзікай няволяй, якую бачыў сьвет. Ведаючы, што ў аб'яднаньні сіла, а ў падзеле — сьмерць, мы і сабраліся сяньня тут, каб залажыць у Францыі Беларускую Незалежніцкую Арганізацыю Моладзі, якая мае арганізаваць тут, на тэрыторыі Францыі, усю беларускую моладзь ды прыцягнуць яе да найбольш актыўнае працы, якой ад нас вымагае грамадзкі абавязак ды будучая доля нашага шматпакутлівага народу.

Верма, што нашая будучая арганізацыя вывяжацца з свайго заданьня, але толькі тады, калі кожнаму з нас будзе залежаць на гэтым, бо кожнаму з нас сьціскаецца сэрца ад пакутаў народу.

Падзелу моладзі быць ня можа, бо кожнаму сапраўднаму беларусу расходзіцца аб тое, каб наш народ быў гаспадаром на ўласнай зямлі, а гэтага мы можам дабіцца толькі

разам, супольнамі сіламі ў адным замкнутым шэрагу. Усялякія ж асабістыя справы ды парахункі не павінны мець месца. Ганебным і здрадлівым быў бы крок тога з нас, хто б для ўласных інтарэсаў ці амбіцый ахвяраваў бы справу такой вялікай вагі, як будучыня свайго народу. Усе ж непаразумленьні, якія зьяўляюцца зусім натуральным зьявішчам у жыцці грамады, павінны бесстаронна разглядацца нашай Управай, якая павінна мець у нас поўны давер.

Калі мы здолеем распачатую працу правесьці да канца, калі мы заложым Арганізацыю Беларускае Моладзі, калі апошняя вывяжацца са сваіх заданьняў, прыцягне да актыўнае працы ўсю нашу моладзь, тады мы сьмела зможам сказаць, што нашае прабыванне на выгнанні было вылучна для барацьбы за долю народу, а не для забесьпячэньня свае галавы ды асабістых выгадаў.

Як бачым, патрэба арганізацыі моладзі ў нас ёсьць неабходная. У гэтым нас пераконвае нашае мінулае жыцьцё і дзейнасьць.

Што да ідэалягічнай асновы нашай арганізацыі, дык яна ёсьць ясная і зразумелая кожнаму сапраўднаму беларусу, бо ў імя яе аддалі жыцьці тысячы нашых братоў і сясьцёр, паўшых у няроўным змаганьні. Інакшыя ідэалягічныя асновы нашай арганізацыі ня могуць быць, іншых, наогул, няма ў беларусаў, а тое, што накідаецца ворагам, хутка, як мыльны пухір гіне, бо атрымоўвае рашучы супраціў з боку нашага народу.

На заключэньне жадаў бы падкрэсьліць асаблівую важнасць паўстаючай Арганізацыі моладзі ды паклікаць усіх прысутных тут братоў-калегаў, як і ўсю беларускую моладзь у Францыі, да зразуменьня вагі распачатай справы і ўсебаковай дапамогі. Калі мы зразумеем гэта ды шчыра возьмемся за распачатую працу, тады мы сьмела зможам глядзець у вочы ня толькі ўсім ворагам, якія стаяць на нашым шляху, але і нашым бацьком, да якіх мы пераможна вернемся, як верныя ім ды Бацькаўшчыне-Беларусі сыны. Дык аддайма ўсё для Бацькаўшчыны.

Жыла, жыве і вечна будзе жыць Беларусь!

Янка Філістовіч

№ 10, 1949 г.

НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ ЗДАБЫВАЕЦЦА ЗБРОЙНА

Прывітальнае слова Зьезду моладзі

Беларуская моладзь у Францыі! Вітаю Вас ад шчырага сэрца з нагоды Зьезду і жадаю Вам як найлепшых вынікаў працы!

Вы стаіцё на парозе жыцьця і кожны з Вас поўны запалу і сьветлых надзеяў на сваю будучыню. Шчасьлівая моладзь тых народаў, якія маюць вольнае й незалежнае жыцьцё, і якая можа спакойна летуцець аб сваім будучым шчасьці. Вам лёс судзіў іначай. Вы пазбаўленыя сваёй Бацькаўшчыны. Вы зьяўляецеся сынамі паняволенага народу, які стогне пад панаваньнем найбольшага прыгнятальніка, якога знае гісторыя, — бальшавізму. А ці ж можа чалавек чуць сябе шчасьлівым, калі ягоны народ у няволі?

Перад Вамі стаіць вялікае й цяжкое заданьне — змаганьне за вызваленьне свае Бацькаўшчыны. Дзеля асягненьня гэтае мэты патрэбна шмат працы і ахвярнасьці. Сярод шматлікіх спраў, якія трэба выконваць, каб асягнуць гэты вялікі й сьвяты ідэал — незалежнасьць Беларусі, найважнейшай справай ёсьць справа вайсковая. Незалежнасьць свайго народу нельга выпрасіць, ня вытаргуюць яе й дыпляматы, яе можна здабыць толькі збройна. Дзейнік зброі зьяўляецца канчаткова вырашальным. Гісторыя дае нам шмат прыкладаў, калі нават малыя колькасна, але моцныя духам і воляй народы шляхам збройнага змаганьня здабывалі сабе незалежнасьць.

Трэба не забывацца, што калі на нашых землях у будучай вайне ня знойдзецца нашае собскае войска, то знойдзецца іншанацыянальнае, ад якога можа быць залежны лёс нашай Бацькаўшчыны. Беларускі народ мае ў сваім характары вельмі карысныя жаўнерскія якасьці. Аб гэтым сьведчаць нашая мінуўшчына і гісторыя войнаў тых народаў, у чыіх арміях былі прымушаныя служыць беларусы.

Ці ведае шырокае беларускае грамадзтва аб тым, што ў жніўні 1920 году ў баёх пад Варшавай, калі была разьбітая бальшавіцкая армія, гэтак зв. Літоўска-Беларуская дывізія, якая складалася з 80% беларусаў, сваімі грудзьмі затрымала ў шмат разоў пераважаючую бальшавіцкую армію і ў цяжкім змаганьні трымала яе на месцы так доўга, пакуль ня быў выкананы манэўр на левае крыло гэтае арміі? Ці

ведае беларускае грамадзтва, што г. зв. «Цуд над Віслай» стаўся дзякуючы ў вялікай меры незвычайнай упорыстасьці беларускага жаўнера, і што ў шматлікіх брацкіх магілах пад Варшавай тлеюць беларускія косьці? Ці ведае шырокае беларускае грамадзтва, што ў гераічных баёх пад Монтэ-Касына бралі ўдзел тысячы беларускіх жаўнераў?

Беларускі вайсковы рух распачаўся пасьля расейскай рэвалюцыі 1917 году, тады ж пачалася арганізацыя беларускага войска. Аднак, нягледзячы на запал беларускай жаўнерскай масы, арганізацыя гэта не дала належнага выніку, дзякуючы малой колькасьці нацыянальна моцных беларускіх афіцэрскіх кадраў, так што ў крытычны мамэнт Беларуская Народная Рэспубліка не патрапіла абараніцца ад бальшавіцкае навалы. Нястача нацыянальна моцных беларускіх афіцэрскіх кадраў не пазволіла разгарнуць арганізацыю беларускага войска і ў часе польска-бальшавіцкай вайны ў 1919—1920 гадох, а гэтаксама не пазволіла адпаведна скарыстаць беларускую самаахову і беларускую краёвую абарону ў 1942—1944 гадох.

Цяпер сьвет стаіць перад пагрозай трэцяй сусьветнай вайны. Ізноў народы будуць вырашаць свой лёс у збройным змаганьні. Той паняволены народ, які патрапіць стварыць сваё войска, будзе мець найбольш шанцаў на здабыцьцё свае незалежнасьці. Таму эміграцыі паняволеных народаў ужо патварылі вайсковыя арганізацыі, якія рыхтуюць кадры для будучага войска. І мы, беларусы, не павінны застацца пад гэтам паглядам бязьдзейнымі. Хто ж павінен тварыць гэтыя арганізацыі і рыхтавацца на будучых камандзераў беларускае арміі, як ня Вы, маладыя беларусы?

Дык да працы! Няхай кожны з Вас станецца піянерам беларускай вайсковасьці. Арганізуйцеся і рыхтуйцеся. Узмацняйцеся духам і целам, здабывайце веду і будзьце гатовыя да вялікіх учынкаў і ахвярнасьці, можа, ужо ў недалёкай будучыні.

Віндзішбэргердорф, 20.I.1949 г.

Францішак КУШАЛЬ, палкоўнік,
Старшыня Галоўнага Ўраду
Задзіночаньня беларускіх
вэтэранаў у Нямеччыне.

№ 10, 1949 г.

ВУЧЫСЯ, ПРАЦУЙ І ЗМАГАЙСЯ, ЯК ВОЛАТ

Апошняя вайна кінула вялікую колькасьць беларускай моладзі за межы сваёй краіны і расьцярушыла яе па ўсёй Эўропе, а пасьля — і па ўсім сьвеце. Ня быў гэта дабравольны выезд за межы сваёй дзяржавы, як гэта мае месца ў заходнім сьвеце, дзе моладзь і ня толькі моладзь з рознымі мэтамі падарожнічае ў чужыя краіны, а пераважна з мэтамі, каб штось новае пабачыць і чагось навучыцца.

Беларуская моладзь у Францыі знаходзіцца ўжо ў стабільных абставінах. Большасьць зь яе не намерваецца падарожнічаць па сьвеце і ўзялася за шуканьне сталага становішча. Гэтае самае можна сказаць і пра моладзь, што выехала ў іншыя краіны: мы ўсе мусім паважна задумацца над жыцьцём і паважна ўзяцца за навуку. Мы не маем на думцы выключна навуку ў сэнсе школьным, не, навуку з жыцьця і для жыцьця.

Мо хто і пачне апраўдвацца, што няма часу, што мы ж — моладзь і таксама павінны прыкладам французаў ці англічанаў пазабаўляцца і весялей правесьці час і г. д. Але мы станоўка павінны адцеміць, што гэткі пагляд не для беларуса. Мы зусім іншы народ, мы зусім іншыя людзі. Мы дзеці паняволенага народу і мы не маем маральнага права на вясельле і марнаваньне свайго жыцьця на данцынгах ці ў кнайпах. Перад намі вялікія абавязкі ў адносінах да свайго народу, дзеля таго між намі не павінна мець мейсца нуда ці няробства, кожны з нас павінен пачуваць сябе барацьбітом за лепшаю долю свайго народу, і кожны наш крок павінен быць азначаны гэтымі абставінамі. Пакідаючы вялікую палітыку нашаму Ураду і Радзе БНР, мы, моладзь, возьмемся за працу, карысную для нашай нацыі, мо нават карысную не ў дадзеным мамэнце, якая дасьць у будучыні аграмадныя карысьці як для народу, так і для нас асабіста. Вучэмся!

Пэўная колькасьць нашай моладзі, хоць мо і невялікая, мае магчымасьць вучыцца ці ў сярэдніх школах, ці нават у вышэйшых. І гэтыя маладыя людзі павінны задумацца, якое гэта вялікае шчасьце — быць студэнтам за мяжою, прыкладам, у Парыжы ці ў Лёндане, ці на якімсь слаўным нямецкім унівэрсытэце. Ці шмат на Беларусі моладзі, што мае адвагу мроіць аб гэтакім шчасьці? Ці мроілі сёньняшнія студэнты

аб гэтым колькі гадоў назад? З поўным перакананьнем мы павінны цьвердзіць, што не, нікому з нас аб гэтым і ня сьнілася. Бо і дзе ж нам, сялянскім сынам, было аб гэтым думаць, калі нават ня ўсе былі нагэтулькі шчасьлівымі, каб вучыцца ў сваёй роднай школе. Тым болей моладзь павінна паважна трактаваць гэтую справу і з большаю энэргіяй брацца за выкарыстаньне сваіх магчымасьцяў, каб пасьля сьмела глянуць у вочы кожнаму, хто б асьмеліўся спытаць: дзе быў і што рабіў. І каб мог сьмела сказаць, што не марнаваў напуста часу і з цяжкасьцю здабываў тых стыпэндыяў.

Але гэтых шчасьлівых ня шмат. Аграмадная большасьць нашай моладзі — гэта не студэнты, гэта звычайныя работнікі, што падпісалі кантракты на працу і павінны працаваць. Але ж і гэтая катэгорыя людзей не пазбаўлена магчымасьцяў вучыцца. Вучыцца ў першаю чаргу той прафэсіі, да якой ён можа прыглядацца падчас сваёй працы, павінен імкнуцца уладжвацца на гэтакую працу, дзе можа расьці ў сэнсе здабываньня прафэсіі, павінен прыглядацца, што ды як робіцца навокал яго ці то на фабрыцы, ці то ў ягоным жыцьці, павінен карыстаць з кожнай нагоды, каб улезьці на якіясь прафэсійныя ці дапаўняючыя адукацыю курсы, вучыцца чужой мовы. Фактычнаю школаю для чалавека зьяўляецца само жыцьцё.

У будучай Беларускай дзяржаве патрэбна будзе міністраў, дыпляматаў, дзяржаўных і тэхнічных адміністратараў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, рамесьнікаў і добрых сьведамых гаспадароў на сваёй гаспадарцы. Кожны з нас мае магчымасьць параўнаць тую пропасьць, якая існуе між любою дзяржаваю Захаду і нашаю Бацькаўшчынай, паняволенай дзьвесьце год і эксплюатаванай нароўні з каляніяльнымі краінамі. Кожны з нас можа лёгка ўявіць, колькі патрэбна будзе працы і веды ўлажыць у адбудову Нашай Краіны, каб дастасаваць дабрабыт нашага народу да дабрабыту заходніх народаў. Колькі трэба будзе мець спэцыялістаў і адміністратараў, каб гэтую мэту асягнуць. Сам факт усьведамленьня гэтай справы пакладае на нас аграмадны і цяжкі абавязак навучыцца чагось, каб у будучыні ня быць бескарысным для народу. Пры гэтым трэба нам ведаць, што нас дома спытаюць: чаго мы навучыліся за мяжою і якую карысную ўмеласьць прынесьлі дадому? А думаем, што было б нам прыкра, калі б пачалі хваліцца ўмеласьцю танца-

ваньня якогась там румба ці прыгожага зьвязваньня краваткі, а асабліва было б прыкра перажыць тую рэакцыю, з якой мы ў гэтым выпадку спаткаліся б у нашым народзе, які, як ведама, ня надта прывык дацэньваць гэтага роду ўмеласьці.

Дык жа хто верыць у справядлівасьць нашай барацьбы за Незалежнасьць Беларусі, хто мае надзею вярнуцца на Бацькаўшчыну і стацца яе паўнавартасным будаўніком, той павінен падумаць ужо сёньня, які ўклад у яе адбудову ён павінен прывесьці з сабою. Ясна, што найбольшым укладам будзе ўмеласьць рабіць штось карыснае.

Часта ўмовы працы паасобнага працаўніка не дазваляюць яму расшырыць свайго кругазору на цэласьць жыцьця краіны, дзе яму давялося жыць. Дзеля таго неабходна там, дзе гэта ёсьць магчымым, арганізавацца і грамадой пачынаць зьведваць усё, што магчыма.

Гэтакія мэтады вывучэньня чужой культуры і саманавучаньня ўжо запачаткаваў Парыскі адзьдзел Аб'еднаньня беларускіх работнікаў у Францыі. Было пастаноўлена прынамсі раз у месяц наладзіць экскурсію ў культурную, навуковую ці прамысловую ўстановы. Першая экскурсія адбылася 15 жніўня г. г. у адзін з найслаўнейшых музэяў сьвету — Луўр. На экскурсію зьявілася каля 40 асобаў. Нягледзячы на ўтомленьне, выйшаўшы з музэю, удзельнікі пастанавілі неўзабаве наведаць іншы музэй, гэтым разам заалягічны. Як відаць, гэты род самаадукацыі вельмі прыпаў да густу нашым маладым беларусам, і калі добра пойдзе, дасьць добрыя вынікі. У праграме наведваньня, апрача шматлікіх музэяў, знаходзяцца электрычныя станцыі, газоўні, цаглярні, фабрыкі парцаляны і г. д.

Пажадана, каб падобнаю працаю зацікавіліся і іншыя асяродкі беларускай моладзі, як у Францыі, так і ў іншых дзяржавах, і сваімі спасьцярогамі і ўражаньнямі дзяліліся на старонках нашай прэсы.

В. С.

І МЫ НЯ ГОРШЫЯ

У сучасным сьвеце ўсюды пануе мода. І вось пайшла мода ў беларускай прэсе хваліць сябе і прасіць другіх, каб таксама хвалілі. І знаходзяцца людзі, што не шкадуюць слоў пахвалы, выпісваюць такія лісты, што чытаў бы і не начытаўся. Адных хваляць, што знайшлі самую моцную сілу, якой могуць скалатнуць увесь свет, што ў іх дух забіяцкі і ўсім яны пакажуць, дзе боб расьце. Другім пішуць што яны самыя ўдалыя патрыёты, якіх сам Бог паклікаў да барацьбы за сваю Бацькаўшчыну. Трэцім ня могуць знайсьці слоў пахвалы, што яны самыя разумныя моваведы, а мову беларускую знаюць назубок і ўводзяць яе ў літаратуру пяшчотную і сэрцакранаўчую. А іншыя так прачульна хваляць рэдактароў, што аж сьлёзы выклікаюцьу чулых сэрцам чытачоў. Усюды толькі пахвалы ды пахвалы.

З «Моладзьдзю» таксама здарыўся адзін выпадак, якога мы таксама ня можам абыйсьці моўчкі.

Пры высылцы апошняга нумару часапісу наш паважаны кальпартэр, не пасьпеўшы выслаць 50 экзэмпляраў, адлажыў іх на наступны дзень. Але назаўтра, пасьля павароту з працы, пабачыў, што часапісы прапалі, бы камень у ваду. Мала таго, калі сеў ён вячэраць, дык заўважыў, што счэзлі з хаты ўсе талеркі, а купіў іх цэлы касцёр на выпадак, калі прыйдуць у госьці сябры, каб было на чым частаваць. Думаў ён, бедны, чухаючы патыліцу, што сталася, дзе прапалі рэчы і як іх адшукаць. Прадумаў цэлы вечар і паўначы ды яшчэ назаўтра думаў пры рабоце, ледзь пальца не ўсадзіў куды ня трэба было, але нічога не прыдумаў. Мучыла яго сумленьне: а што скажуць чытачы «Моладзі», калі не атрымаюць часапісу? Пастанавіў назіраць, ці будуць прападаць у хаце і другія рэчы. Але нічога больш не прапала. Што сталася з часапісамі і талеркамі — асталося загадкай. Але хутка яна выясьнілася.

Прайшло некалькі дзён і наш кальпартэр, вярнуўшыся з працы, убачыў на стале сваю талерку, а на талерцы — ліст. Зацікаўлены, разгортвае яго і бачыць, што пасланы ён з Марса, але пісаны на беларускай мове. Чытае: «Паважаны спадар Рэдактар! Мне трапіў у рукі Ваш часапіс, за які Вам шчыра дзякую. Ён найбольш мне спадабаўся з усіх газэтаў і часапісаў сьвету і буду Вас прасіць, каб Вы мне яго надалей высылалі. Яго толькі буду чытаць, бо ён ёсьць адзіным

праведным і цікавым. А які колкі ў Вас гумар! Мы, марсыяне, аж за бакі браліся, так сьмяяліся з № 26 Вашага часапісу. Жадаю Вам далейшае плённае працы і добрага натхненьня. Ваш верны С. Пустахвал».

На другі дзень прыходзяць 2 лісты:

«Высокапаважаны спадар Рэдактар! Аж загойдалася з радасьці маё сэрца, калі атрымаў Ваш часапіс. Сколькі парыву, сілы, моладасьці б'е зь яго, які магутны творчы дух вее з кожнага слова! Такога геніяльнага часапісу як Ваш, няма больш на сьвеце. Шчыра Вам дзякую! Бывайце! З пашанай Ваш будучы верны чытач Сама Дур».

А ў другім: «Вашая работа, якую Вы праводзіце, ацэніцца ў будучыні ды зьбярэ шмат плёну. Калі гэта не саламяны агонь, дык з Вашых радоў узгадуюцца вялікія патрыёты — волаты Вашага народу... Ваш Пуста Меля».

(Якія дзіўныя на Марсе імёны.)

І так кожны дзень прыбывалі лісты, прыляталі з Марса на загубленых талерках, аж наш бедны кальпартэр ня ведаў, што зь імі рабіць, бо ня меў часу іх чытаць. А калі б рэдакцыя зажадала зьмясціць іх у часапісе, дык хапіла б што друкаваць аж на 5 гадоў, бо былі між імі сапраўдныя оды, якія можна было б выдаць брашурай.

І так прыбыло ў рэдакцыю аж 50 лістоў. Нават сам кароль марсыянаў нам напісаў:

«Лічу для сябе вялікім гонарам пажадаць вашай геніяльнай рэдакцыі далейшае плённае працы...» А нават прыслаў перадпіску за часапіс аж на 3 гады наперад.

Дык вось, дарагія чытачы, як нас высока ацанілі! Хто з вас цяпер можа асьмеліцца сказаць, што наш часапіс малавартасны, калі яго ацанілі самыя геніяльныя людзі ў Сусвеце — марсыяне. Калі пасьля гэтага знойдзецца нехта, што адважыцца аб нас гаварыць зьневажальна, дык будзе сьведчыць сам аб сабе, што ён — бязглузды чалавек. Так ацэняць яго марсыяне, так ацэнім яго мы — рэдактары геніяльнага часапісу.

М. Смага

№ 27, 1952 г.

НА ПАРОЗЕ ДРУГОГА ПАЎВЕЧЧА

З канцом 1950 году мінула першая палова XX веку, якая прынясла для людзкасьці самыя большыя асягненьні ў галіне тэхнікі, навукі, вялікую колькасьць вынаходак ва ўсіх галінах людзкога жыцьця. Гэта спрычынілася да выдатнага палепшаньня матэрыяльных умоў чалавека, высока ўздымаючы гігіену і даючы яму магчымасьць лягчэй бараніцца перад рознымі хваробамі; стварыла хуткія і выгадныя магчымасьці падарожжа, а газэты, радыё, тэлевізія, кіно хутка інфармуюць найшырэйшыя кругі грамадзянства. Здавалася б, людзкасьць хутка крочыць да лепшае будучыні...

Але як ні парадаксальным можа паказацца, гэтая ж самая першая палова XX стагодзьдзя прынясла для сьвету такія няшчасьці, як таталітарныя сыстэмы кіраваньня дзяржавамі, дзьве сусьветныя вайны зь іх жахлівасьцямі ў нечуванай да гэтага часу ступені. Людзі навучыліся будаваць хмарадзёры, але так жа — і канцэнтрацыйныя лягеры з камэрамі сьмерці; вынайшлі спосаб масавага вынішчэньня цэлых народаў, а ў канцы — атамную бомбу. Некатарыя гэты цяжар войнаў скідаюць на плечы вучоных, кажучы, што яны ёсьць прычынай усіх няшчасьцяў, бо яны парабілі вынаходкі, яны ўдасканалілі мэтады масавага вынішчэньня людзей, яны пабудавалі атамную бомбу. Гэтак могуць разважаць толькі тыя, якія ня маюць шырэйшага кругазору думкі, якія ня ёсьць здольныя задумацца над самай сутнасьцю рэчаў. Бо калі напрыклад скідаць на плечы вучонага Фэрмі і яго супрацоўнікаў віну за вынаходку атамнае бомбы, якая была прычынай сьмерці сотні тысячаў людзей у Гірошыма і Нагасакі, дык гэтым самым трэба абвінавачваць усіх вучоных ад канца XIX стагодзьдзя, пачынаючы ад Бэккэрэля, Рэнтгэну і др., якія першыя рабілі пошукі атамнае энэргіі. Калі абвінавачваць Альфонса Пэно за пабудову першай мадэлі самалёту, дык трэба таксама абвінавачваць Леанарда да Вінчы, які ўжо ў XVI стагодзьдзі рабіў спробы лятаць. І так можна дайсьці да нашых пра-прашчураў, да першабытнага чалавека і абвінавачваць яго за вынаходку агню, нажа, сякеры; бо агонь спрычыняецца да выбуху пораху, які ўжываецца на вайне... Гэткіх прыкладаў можна прывясьці надта шмат. Таму неразумным ёсьць паўтараць думку, што вынаходкі вучоных вядуць да закалотаў.

Сяньня людзкасьць у яе няўпынным маршы да новых асягненьняў няможна паўстрымаць, так як няможна паўстрымаць бегу часу.

Але некаторыя вучоныя, дактары і псыхолягі пачалі шукаць прычынаў людзкіх няшчасьцяў крыху глыбей, а найменна ўнутры кожнага чалавека, у ягонай душы. Яны, наглядаючы за жыцьцём, пабачылі, што нягледзячы на ўсе асягненьні мэдыцыны, на тое, што сяньня можна нясьці хвораму хуткую помач, штораз больш напатыкаецца людзей, фізычна няздольных, здэгенэрованых або ўмыслова хворых. Калі ўзяць у рукі газэту, дык аж жудасна робіцца ад такой колькасьці забойстваў, нападаў, зладзействаў, гвалтаў. Можна падумаць, што жывём на нейкім кашмарным сьвеце. Гэтыя назіраньні прывялі вучоных да цьверджаньня, што большасьць хваробаў мае свой зародак у душы чалавека, яго немаральным, нерэлігійным жыцьці. Можа выздаравець толькі той хворы, які цьвёрда верыць у перамогу над сваёй хваробай, які верыць у вышэйшую апеку над сабой, якая яму дадае сілаў перамагчы зло. А той чалавек, які мае моцны характар, глыбокую веру, той рэдка бывае хворым.

Калі ж большасьць людзей у грамадзтве будуць маральна і духова слабымі, ня маючымі вышэйшых мэтаў у жыцьці, акрамя дачасных матэрыяльных дастаткаў, тады яны ўпадаюць нізка, дэмаралізуюцца і гэта прыводзіць пазьней да нязгодаў між людзьмі, да сацыяльнай няроўнасьці, да зайздрасьці, да нянавісьці, а ўрэшце да рэвалюцняў і войнаў.

Вось як аб гэтым піша французкі вучоны доктар Картон:

«Нашая генэрацыя ёсьць ахвярай грубага і вузкага матэрыялізму, які пануе амаль ва ўсіх асяродзьдзях нашага веку. Прызнаваць наяўнасьць толькі тога, што бачым і чуем, верыць і паўтараць, што ўсе жыцьцёвыя зьявы, зьявы космасу адбываюцца прыпадкова і без ніякае мэты, без уплыву галоўнае кіруючае сілы і без удзелу надпрыроднае сілы — гэта азначае скрываць наяўнасьць духовае і жыцьцёвае сілаў, узгадоўваць эгаізм і пабуджаць нізкія інстынкты задаваленьня».

Грамадзкасьць, перакананая ў тым, што ўсё ў жыцьці абмяжоўваецца эгаістычным імкненьнем да матэрыяльных і натыхмястовых дастаткаў, была адхілена ад галоўных абавязкаў навукі і маралі. Яна напраўлена ў кірунку ўцехаў грубых і лёгкіх, жадае жыць абыякава, на кароткую мэту, толькі каб яе сэксуальныя апэтыты былі задаволеныя. Людзтва пачынае думаць аб тым, каб красьці, ненавідзець, забіваць і шмат забаўляцца. У выніку гэтага выяўляюцца страшэнныя цярпеньні, спрычыненыя вайною, рознымі хранічнымі хваробамі і дэгенэрацыяй.

Гэты біч прыроды, які спадае на плечы людзей, ёсьць напамненьнем і мэтадам узгадаваньня, які прырода выкарыстоўвае для паўстрыманьня людзей ад зла, калі яны моцна забываюцца аб сваіх абавязках і сваёй апошняй мэце.

Так, гэта прырода імкнецца паправіць памылкі чалавека, напамінаючы яму ў балючы спосаб, каб жыць здаровым і шчасьлівым, трэба жыць маральна, трэба каб розум кіраваў усімі ўчынкамі і не даваў волі імпульсам вузкіх гонаў. Трэба, каб адначасна з развіцьцём матэрыяльным ішло ўпоруч і маральнае ўдасканаленьне чалавека. Прырода напамінае аб тым, што сапраўднае, шчасьлівае жыцьцё асягнуць людзі тады, калі ўзмоцняць падставы ўзгадаваньня адзінкі, уводзячы яе ў хрысьціянскую навуку, навуку ўзаемнае любові, ахвярнасьці. Толькі тады могуць настаць сапраўдны мір між людзьмі, парадак і здароўе ў грамадзтве. Але ў гэтым напрамку мусяе зрабіць высілак кожная адзінка.

Таму, мой мілы дружа, зьвярні таксама на сябе ўвагу, заглянь у глыбіню свае душы і пабач, што ёсьць тым асатом, які яе калечыць і не дазваляе табе жыць шчасьліва. Калі яго знойдзеш, дык пастарайся яго выкараніць, пастарайся вярнуцца на справядлівую дарогу. Гэтага ад цябе вымагаюць твае сябры, гэтага ад цябе вымагае твая Бацькаўшчына, твае бацькі і ўвесь беларускі народ.

Міхась Камянко

№ 15, 1949 г.

НА ПЕРАВАЛЕ СТАГОДЗЬДЗЯ

Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё ж такі жыцьцёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла…

М. Багдановіч

Пасьвячаючы наш артыкул Новаму, 1950 году, мы пастараемся разгледзець апошняе паўвечча ў жыцьці беларускага народу ды вывесьці нашыя падсумкі на будучыню.

Цяжка зьмясьціць у кароткім артыкуле паўвяковы шлях гісторыі народу, поўны глыбокіх устросаў і перажываньняў, таму абмяжуемся толькі кароткім апісаньнем пачатковае і канчатковае стадыі гэтага шляху.

Як жа выглядае гэты шлях?

1900 год. Магільная цішыня панавала на Беларусі. Сам назоў краіны заменены на «Северо-Западный край». Народ нясьведамы, няграматны, ніводнае беларускае школы, ніводнае арганізацыі. Толькі далёка ад Бацькаўшчыны пачыналі тварыць свае гурткі беларускія студэнты. Беларускае друкаванае слова забароненае. У сьвятынях чужая мова і вынарадаўляючая палітыка. Лічная беларуская эміграцыя гіне бясьсьледна у чужацкім моры. Ніхто, даслоўна ніхто, не падымае голасу ў абароне Беларусі. Яна прызначаная на сьмерць зажыва. Ёй выкапаная магіла, кайданы на нагах, на руках і на вуснах. Магільны крыж — як памятнік слаўнае мінуўшчыны. Вось як выглядала нашая Бацькаўшчына паўвеку таму, вось у якім стане застаў яе 1900 год.

Ані жудаснае становішча, ані тэрор і перасьлед беларушчыны не змаглі, аднак, зламаць народнае душы, бо народ жыў і, як усё жывое, разьвіваўся, узбагачваў сваё жыцьцё. Народ чакаў таго часу, калі, як пісаў М. Багдановіч, «прыйдзе й на яго чарада». Дарма, што акупант уважаў наш народ пакойнікам; ён жыў ды зьбіраў сілы для барацьбы. Магутны кліч Каліноўскага, кінуты яшчэ паўвеку таму, дайшоў да народу беларускага. Кліч гэты падхопліваюць браты-Луцкевічы, Уласаў, Купала, Багдановіч і цэлы рад другіх верных сыноў Беларусі. Яны разбуджаюць народныя масы ды ахвярнай працай праводзяць у жыцьцё запавет Каліноўскага. Кадры інтэлігенцыі і ахвярных барацьбітоў растуць так хутка, што ў 1918 годзе, 25-га Сакавіка, Рада Беларускае Народнае Рэспублікі мела непахіснае перакананьне абвесьціць Беларусь вольнай і незалежнай Рэспублікай. Дарма, што чорныя сілы здушваюць гэты сьветлы Акт. Агонь запалены ім у грудзёх беларусаў, не пагас да нашых дзён, нягледзячы на ўсе высілкі ворагаў, бо да нашых дзён вядзецца няўпыннае народнае змаганьне за ажыцьцяўленьне векапомнага Сакавіковага Акту. Змаганьне, якое ня толькі ня зьменшваецца, але штораз большае.

Што ж мы бачым сяньня, пераступаючы парог новага паўвечча?

Мы выразна бачым за намі цярністую дарогу, усланую касьцямі лепшых сыноў і дачок Беларусі. Мы бачым лічныя магілы ведамых і няведамых герояў-волатаў, якія раскіданыя па ўсёй шырокай Беларусі і сьвеце. Сяньня ані «Северо-Западный край», ані «Крэсы» не ўспамінаюцца. Толькі ў гістарычных дакумэнтах і архівах захаваюцца яны, як помнік жудаснае мінуўшчыны, якую давялося перажыць беларускаму народу. Нішто іншае, як толькі ўспомненыя магілы герояў, найбольш пераконваючыя сьведкі нязломнасьці волі народнага духу, змусілі ворага ісьці на ўступкі, адступаць, падстаўляць розныя «вывескі». Хоць цана ім ведамая, аднак факт незапярэчны і гаворыць сам за сябе: 30-ці гадовы экспэрымэнт над душой народнай пераканаў акупанта, што жывога народу зламаць нельга. Не зважаючы на шматлікую армію ворага, гаспадарамі беларускіх лясоў зьяўляюцца беларускія партызаны.

Калі 50 год таму беларусы ня мелі ніводнае школы, дык сяньня іх маюцца тысячы. Эміграцыя, хоць яна расьцярушаная і нешматлікая, мае ня толькі свае школы, студэнцтва, дзясяткі розных арганізацыяў і часапісаў, але і сваю нацыянальную царкву. Мы маем сяньня тое, чаго ня маюць народы, яшчэ так нядаўна ўтраціўшыя сваю дзяржаўнасьць, — праўны Ўрад Беларускае Народнае Рэспублікі, зь якім змушаны рахавацца нават самі бальшавікі, падстаўляючы народу ўзамен сваю фікцыю. Вось нашыя здабыткі за апошняе паўвечча. І мы мусім прызнаць, што беларускі народ без падтрымкі збоку зрабіў гіганцкі крок уперад, крок, якога ня змог зрабіць у гэткім кароткім часе ніводзін народ.

Калі параўнаем Беларусь з нашымі суседзямі ў 1900 годзе і сяньня, дык убачым нашую жыцьцяздольнасьць і тую сьветлую будучыню, якая чакае нас уперадзе. Цьверджаньне нашых суседзяў аб нашай слабасьці зусім неабгрунтаванае і разрахаванае на аслабленьне нашае сілы. Сяньня мы, беларусы, моцныя, як ніколі дагэтуль, бо кожны з нас поўны сілы і веры ў лепшае заўтра, бо маем мы выгадаваныя і загартаваныя ў змаганьні нацыянальныя кадры моладзі, якая за народную волю гатовая на найбольшыя ахвяры. Хто недаацэньвае гэтага факту — ня бачыць сапраўднасьці, стаецца, магчыма, нават падсьведама, прыслужнікам ворагу, а тым самым аддзяляе сябе ад народу.

Уважна глянуўшы на сучасныя міжнародныя падзеі і паводзіны нашых акупантаў, можна сьцьвердзіць панічны

страх ворагаў перад беларускім нацыянальна-вызвольным рухам. Страх гэты ня ёсьць беспадстаўным. Толькі руху нашага не спыніць ніякай сілай, ніякай пагрозай. Мы, беларусы, стаімо сяньня на выхаднай пазыцыі, якая вядзе наш народ у апошні рашучы бой за канчатковае вызваленьне свае радзімы. Беручы пад увагу вышэйсказанае, мы ня толькі не павінны, але і ня маем права аддавацца пэсымізму. Навальніцы, якія чакаюць нас уперадзе, не павінны нас палохаць, толькі яны дапамогуць вярнуць нам утрачанае. Абавязак нашае моладзі — аддаць усе сілы на падтрыманьне праўнага і адзіна прызнаванага чужынцамі Ўраду Беларускае Народнае Рэспублікі, які йдзе па шляху ажыцьцяўленьня сьвятых запаветаў. Той зь беларусаў, хто ў гэты дэцыдуючы мамэнт паўстрымаецца ад актыўнага ўдзелу ў змаганьні, зробіць праступства ў адносінах да свайго народу, вольны голас якога мае права падаваць і падае БНР у выгнаньні. Калі мы хочам быць годнымі сынамі нашага народу-героя, які ўжо 30 год вядзе бой з бальшавікамі за сваё чалавечае і народнае права, мы павінны скаардынаваць нашую працу і высілкі тут, у выгнаньні, зь ягоным змаганьнем на Бацькаўшчыне. Мы павінны ўзьняць наш бел-чырвона-белы сьцяг між вольнымі народамі на чужыне так высока, каб ягоную прысутнасьць у вышыні ўбачылі нашы браты і сёстры ў забраным Краі.

Янка Філістовіч